Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЖНІЎНЯ 2012 г. СУБОТА № 164 (27279) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Новы сімвал з'явіцца ў Навагрудка, падкрэсліць яго статус надзвычай прывабнага для турыстаў горада. І сімвал цэлай эпохі — любімы народам паэт Уладзімір Высоцкі. У горадзе адкрыецца сквер імя паэта і барда. СТАР. 3

У выхадныя дні на Блакітнай крыніцы шмат людзей. Яны спяшаюцца пабачыць дзіва прыроды і імкнуцца выканаць старадаўні абрад — акунуцца ў ваду альбо тройчы перайсці ручай, каб здабыць шчасце і здароўе. СТАР. 6

Пецярбург добра аглядаць цяпер, летам, падчас белых начэй. Калі ўвогуле гэта можна назваць такім словам — «ноч». Гэта нейкія занадта пахмурныя дні, не больш за тое... СТАР. 6

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«Беларусь — адкрытая міралюбівая краіна»

Беларусь — адкрытая міралюбівая краіна. Аб гэтым учора, сустракаючыся з удзельнікамі тэлепраекта «Сардэчна запрашаем у Беларусь», заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыў Прэзідэнт, словамі «Сардэчна запрашаем у Беларусь» у краіне вітаюць усіх гасцей, якіх беларусы ўмеюць і любяць прымаць. «Беларусь — адкрытая краіна. Мы вельмі міралюбівы, вельмі шчыры народ і хочам сябраваць з усімі, свабодна гандляваць, ездзіць адзін да аднаго ў госці, размаўляць, сустракацца. У нас няма варожасці ні да кога. Мы заўсёды жадаем усім дабра, шчасця і працвітання», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Звяртаючыся да замежных гасцей, Прэзідэнт падкрэсліў, што іх свежыя ўражанні ад тыднёвага наведвання Беларусі асабліва каштоўныя: «Мы жывём у Беларусі, любім яе. Але з часам прывыкаеш і да навакольнага хараства, перастаеш гэтаму здзіўляцца. У Беларусі вельмі шмат цудоўных мясцін, дзе адпачываеш душой».

Замежныя госці мелі магчымасць наведаць самыя маляўнічыя мясціны Беларусі, убачыць лепшыя прадпрыемствы. «Беларусы заўсёды былі народам-працаўніком. БелАЗ, кандытарская фабрыка «Спартак», «Белшына» — усё гэта гонар Беларусі. Гасподзь не даў нам мноства прыродных рэсурсаў, і беларусы спакон веку прывыклі зарабляць на жыццё сваімі рукамі і сваім інтэлектам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, гэта сустрэча — магчымасць пачуць меркаванне прадстаўнікоў іншых дзяржаў аб Беларусі. «Калі вы заўважылі нейкія недахопы — скажыце нам. Паверце, ваша меркаванне для нас для ўсіх і для мяне як Прэзідэнта вельмі важнае. Вы глядзіце на нас новым поглядам, вашы ўражанні выразныя і свежыя, — адзначыў беларускі лідар. — Але галоўнае — усе вы шчырыя, адкрытыя людзі, якія, як я спадзяюся, жадаюць дабра нашай зямлі і нашаму народу. Выслухаўшы ваша меркаванне, мы падумаем, як зрабіць Беларусь яшчэ лепшай». Аляксандр Лукашэнка запрасіў усіх удзельнікаў сустрэчы да адкрытай размовы аб Беларусі.

У рамках тэлепраекта Беларусь наведалі шэсць замежных сем'яў з Кітая, Германіі, Паўднёвай Карэі, Іспаніі, Францыі і ЗША. Усе сем'і прыехалі ў рэспубліку ўпершыню.

Перад удзельнікамі праекта ставілася задача максімальна вывучыць выдатныя мясціны адной з абласцей Беларусі. На працягу пяці дзён яны падарожнічалі па краіне, сустракаліся з яе жыхарамі, знаёміліся з вядучымі прадпрыемствамі, каштавалі стравы нацыянальнай кухні, вывучалі беларускую гісторыю і культуру.

Як адзначаюць арганізатары, галоўная задача праекта — вачамі замежных гасцей паглядзець на сваю краіну, пераканацца ў тым, што ў Беларусі ёсць шмат таго, чым можна ганарыцца і што варта цаніць.

БЕЛТА.

ЛЕСАРУБЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Учора ў сталічных Раўбічах распачаўся 30-ты чэмпіянат свету вальшчыкаў лесу. Па-простаму, лесарубаў. У Беларусі сабралася 29 каманд з далёкіх і блізкіх краін, удзельнікі якіх з'яўляюцца звычайнымі ляснымі працаўнікамі. Яны ж — прадстаўнікі даволі небяспечнай прафесіі. Таму адна з ідэй гэтага чэмпіянату — дэманстрацыя і папулярызацыя бяспекі працы лесаруба.

Шмат цікавых і відовішных спаборніцтваў убачаць гледачы з раўбіцкіх трыбун: дакладная і хуткая распілоўка дрэва, абрэзка сучча, мантаж бензапілы. Дарэчы, цяпер сярэдняя хуткасць зборкі пілы на чэмпіянатах свету — 8 секунд. Ці будуць пастаўлены новыя рэкорды ў гэтым спаборніцтве, даведаемся літаральна сёння ці заўтра. Таму раю наведаць Раўбічы як мага хутчэй, каб не прапусціць штось незвычайнае. Каму больш цікава ўбачыць валку лесу, раім наведаць лесасеку каля вёскі Паграбішча Лагойскага раёна, дзе былі зроблены гэтыя фотаздымкі.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

ЛІЧБА ДНЯ

6,5 млн. кв. м

агульнай плошчы жылля прадугледжана ўвесці ў эксплуатацыю ў Беларусі ў 2013 годзе, у тым ліку 2,5 млн. кв. м — з дзяржаўнай падтрымкай, паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада. Прагнозам, узгодненым з Мінэканомікі, на 2013 год разліковы паказчык кошту 1 кв. м жылля, якое будуецца з дзяржпадтрымкай, вызначаны ў памеры 4,6 млн. рублёў. Сярэдні кошт 1 кв. м жылля з дзяржпадтрымкай за першае паўгоддзе сёлета, па дадзеных Белстата, склаў Br3 млн. 108 тыс.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 25°
Віцебск	+ 20°
Гомель	+ 24°
Гродна	+ 21°
Магілёў	+ 20°
Мінск	+ 22°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.08.2012 г.

Долар ЗША	8340,00	▲
Еўра	10450,00	■
Рас. руб.	262,00	▼
Укр. грыўня	1029,44	▲

■ Парламенцкія выбары-2012

БОЛЬШ ЗА ПАЛОВУ ЗАРЭГІСТРАВАНЫХ КАНДЫДАТАЎ — ПРАДСТАЎНІКІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ

Прыём дакументаў на рэгістрацыю кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь завершаны. Прыняты і ўсе скаргі па адмовах у рэгістрацыі. Зараз зарэгістраваны 363 кандыдаты. Гэта на 90 чалавек больш, чым было пасля рэгістрацыі кандыдатаў у 2008 годзе. Апроч таго, вельмі буйное партыйнае прадстаўніцтва. 206 кандыдатаў з'яўляюцца прадстаўнікамі палітычных партый. Сярод іх чыста партыйнае вылучэнне — 204 чалавекі. Для параўнання: у 2008-м ад партый вылучыліся толькі 50 кандыдатаў. Астатнія два чалавекі таксама партыйцы, але яны вылучаліся не праз палітычныя партыі (адзін з Аграрнай партыі, другі — прадстаўнік БНФ). СТАР. 2

НОВЫЯ ГОРКІ

У новапабудаваным інтэрнаце Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках рыхтуюцца да прыёму гасцей «Дажынак-2012».

Новы інтэрнат у Горацкай акадэміі нездарма называюць «шыкоўным». Гэта прыгожы і сучасны будынак: 9 паверхаў, 860 месцаў, 122 блокі (у кожным — кухня і ўсе выгоды), 20 абсталяваных для інвалідаў пакояў, філіял бібліятэкі, дзве трэнажорныя залы, пакой для клубнай працы, бытавыя памяшканні і шмат чаго іншага.

Адметнасцю інтэрната з'яўляецца лакальная вылічальная інтэрнэт-сетка, якая дапаможа маладым людзям у вучобе. У светлых пакоях, разлічаных на два-тры чалавекі, усталявана новая мэбля айчыннай вытворчасці. Тут будзе камфортна жыць спачатку гасцям «Дажынак», потым — горацкім студэнтам. СТАР. 2

■ «Прамая лінія»

ПРА ПЕНСІІ, І НЕ ТОЛЬКІ

У чарговай «прамой тэлефоннай лініі» ў сценах рэдакцыі газеты «Звязда» прыме ўдзел **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна Аляксандраўна РАМАНОВІЧ.** Задаць пытанні Жанне Аляксандраўне можна будзе ў сераду, **29 жніўня, з 10.00 да 12.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.** Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумары **8 (017) 287 18 29.**

Трастбанк

Уважаемые вкладчики ЗАО «Трастбанк»!

Информируем вас о том, что с **01 октября 2012 года** будут действовать новые условия по следующим вкладам в иностранной валюте:

Вид вклада (депозита)	Ранее действующий размер процентных ставок	Новый размер процентных ставок (с 01.10.2012)
«VIP»	10%	6%
«VIP»	8,2%	6%
«VIP»	7,5%	6%
«VIP»	7%	6%
«VIP+1%»	11%	6%
«VIP+1%»	8,2%	6%
«VIP+1%»	7,5%	6%
«VIP+1%»	7%	6%
«Хороший вклад» 1 год и 10 дней	9%	6%
«Хороший вклад» 1 год и 10 дней	9,5%	6%
«Хороший вклад» 1 год и 10 дней	8%	6%
«Шкварка»	8,3%	7,5%

По возникшим вопросам Вы можете обратиться в контакт-центр Банка (**465** – с мобильного, **8 801 100 33 33** – бесплатный номер для звонков с городского телефона).

ЗАО «Трастбанк», УНП 100789114. Лиц. №14 от 13.11.2008 г. НБ РБ.

Открытое акционерное общество «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

сообщает, что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк» 7 сентября 2012 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме.

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

Повестка дня

1. О безвозмездной передаче в коммунальную собственность имущества ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 27 августа 2012 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 27 августа по 5 сентября т.г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 5 сентября 2012 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка, филиалов (отделений) по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 54 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

Телефон для справок: 8(017) 229 64 54.

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЧЫЛІ ПАДЧАС МАСАВЫХ МАНІФЕСТАЦЫЙ НАВУЧЭНЦАЎ ПАРАНЕНЫ 18 ПАЛІЦЭЙСКІХ

У чылійскай сталіцы Сант'яга падчас маніфестацый навучэнцаў, якія патрабуюць паляпшэння якасці адукацыі, паранены 18 паліцэйскіх, затрыманы 140 чалавек. Пра гэта паведамілі мясцовыя ўлады. Паводле інфармацыі праваахоўных органаў, у 14 несанкцыянаваных акцыях пратэсту, якія праходзілі адначасова ў розных частках горада, прынялі ўдзел 8 тыс. студэнтаў і школьнікаў. Цяперашнія дэманстрацыі ў Чылі сталі кульмінацыяй іншых акцый пратэсту, якія працягваюцца ўжо тры тыдні. За гэты час адбываліся захопы школ і дзяржаўных установ, вулічныя маніфестацыі. Школьнікі патрабуюць забараніць камерцыйную дзейнасць навучальных устаноў, якія атрымліваюць фінансаванне з бюджэту, а таксама перадаць дзяржаўныя школы пад юрысдыкцыю цэнтральных улад ад мясцовых муніцыпалітэтаў, якія адчуваюць недахоп у сродках. Студэнты, у сваю чаргу, настойваюць на ўвядзенні бясплатнай сістэмы вышэйшай адукацыі, патрабуючы склікаць па гэтым пытанні агульнанацыянальны рэферэндум.

УРАД КЫРГЫЗСТАНА АДПРАЎЛЕНЫ Ў АДСТАЎКУ

Прэзідэнт Кыргызстана Алмазбек Атамбаеў падпісаў указ аб адстаўцы ўрада краіны, перадаюць інфармагенцтвы. У дакументе адзначаецца, што ўрад сышоў у адстаўку ў сувязі з развалам парламенцкай кааліцыі большасці, якая яго сфарміравала. Да фарміравання новага ўрада дзеючы склад Кабінета Міністраў на чале з прэм'ерам Бабанавым будзе выконваць свае абавязкі.

У ГРЭЦЫІ ЗАДУМАЛІСЯ АБ ПРОДАЖЫ АСТРАВОЎ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З КРЫЗІСАМ

У Грэцыі задумаліся аб продажы або здачы ў арэнду незаселеных астравоў, паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы са спасылкай на прэм'ер-міністра краіны Антоніса Самараса. Камерцыйнае выкарыстанне астравоў можа быць магчыма толькі ў тым выпадку, калі гэта не будзе парушаць патрабаванні нацыянальнай бяспекі. Самарас абмовіўся, што ўрад не будзе «пазбаўляцца» ад астравоў «па дзяшоўцы». Гаворка ідзе аб магчымым ператварэнні незаселеных тэрыторый у аб'екты, якія будуць прыносіць прыбытак.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

СУД НАРВЕГІІ ПРЫСУДЗІЎ БРЭЙВІКА ДА 21 ГОДА ТУРМЫ

Суд аднагалосна вынес рашэнне аб тым, што падсудны быў пры свядомасці падчас здзяйснення злачынстваў, і за забойства 77 чалавек прысудзіў да 21 года турмы. Гэта максімальны тэрмін, прадугледжаны нарвежскім заканадаўствам. Але тэрарыста могуць пакінуць пад вартай і па заканчэнні гэтага тэрміну, калі ўбачаць у ім пагрозу для грамадства.

Нарвежац адправіцца ў асобны корпус у турме Іла і падчас зняволення будзе абавязаны працаваць пяць дзён у тыдзень.

Андэрс Брэйвік летам 2011 года здзейсніў двайны тэракт. Спачатку ён падарваў бомбу ў цэнтры Осла, пасля чаго адкрыў стральбу па ўдзельніках моладзевага лагера кіруючай партыі на востраве Утоя.

КАРАТКА

З удзелам дзяцей за сем месяцаў 2012 года ў Мінску здзейснены 40 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 41 дзіця атрымала траўмы і калецтвы.

Паводле вынікаў ЦТ сярод выпускнікоў школ, гімназій і ліцэяў у 2012 годзе сярэдні бал па рускай мове склаў 40,3, па беларускай — 37,4, па фізіцы — 24,9, па матэматыцы — 33,3, па хіміі — 42,3, па англійскай мове — 41,7.

Пазітыўныя тэндэнцыі развіцця эканомікі краіны дазволілі ўраду Беларусі прыняць дадатковыя меры па апераджальным выкарыстанні рэсурсаў, прызначаных для фінансавання будаўніцтва жылых дамоў і інжынерна-транспартнай інфраструктуры да іх.

Беларускі гандлёвы цэнтр ствараецца ў Іраку. Дзейнасць цэнтра будзе накіравана на павелічэнне паступлення тавараў беларускіх вытворцаў на іракскі рынак, прыцягненне кампаній Ірака да інвесціравання ў Беларусі, падбор партнёраў для рэалізацыі сумесных праектаў.

ЦІ ЛЮБІЦЕ ВЫ ПАДАРОЖНІЧАЦЬ І ЧЫМ, НА ВАШУ ДУМКУ, КАРЫСНЫЯ ПАДАРОЖЖЫ?

Таццяна ЧЫЖ, бухгалтар СВК «Вінец», Бярозаўскі раён:

— Падарожнічаць падабаецца. Але ў нас гэта не часта бывае. Вясковае жыццё такое, што не асабліва ёсць магчымасць для падарожжаў. Ёсць жаданне, але яшчэ на гэта патрэбны грошы і вольны час. Асабліва летам: ідзе ўборачная, усе працуюць на яе. Нам сёлета вельмі пашчасціла: ажыццявілі шматгадовую мару. Уборачная блізіцца да заканчэння, і старшыня дазволіў пайсці ў адпачынак, адпусціў на дзесяць дзён нашага тату, які працуе кіроўцам. Першы раз у жыцці паехалі ў адпачынак на мора ў Алушту ўсёй сям'ёй сваім ходам. Дачка ўжо працуе, сын вучыцца, і яны вельмі хацелі гэтага, былі рады падарожжу, якое, безумоўна, спадабалася: паглядзелі, у моры паплавалі. Падарожжа — гэта цудоўна! Нават тое, што ты ў іншае месца патрапіў, — ужо шмат дае. А калі яшчэ і адпачынак — сонца і мора, то ўражанняў хопіць на ўсё жыццё.

Арцём КАВАЛЕЎСКІ, паэт:

— Вельмі люблю падарожнічаць. Лічу гэта карыснай справай, таму што такім чынам можна спасцігаць свет, пабачыць, як жывуць у іншых мясцінах і іншымі вачыма паглядзець на сябе. Падарожжы і ўражанні, якія яны даюць, вельмі спрыяюць творчасці, нараджэнню вершаў. Але сёлета так атрымалася, што я не выязджаў з Беларусі, а ездзіў у Слабодку, што на Браслаўшчыне. Жыў у вясковай хаце ў цёці Ядзі — танна, але вельмі ўтульна і душэўна. Там маляўніча, прыгожа. Я шпацыраваў удзень кіламетраў па 20, даследаваў суседнія вёскі, і гэта аказалася досыць цікава. Але чым яшчэ карысныя падарожжы — з'яўляюцца новыя знаёмыя. Напрыклад, я пазнаёміўся з мясцовым ксяндзом Сяргеем і даведаўся, што ён піша вершы. Я лічу, што творчы чалавек павінен падарожнічаць. Трэба выязджаць з горада, каб ратаваць сваю душу ад бетонна-асфальтных рамак, даючы магчымасць пачувацца больш вольна ў натуральных умовах.

Уладзімір УРОДНІЧ, мастак:

— Цяпер для маладых людзей, якія маюць матэрыяльную магчымасць некуды з'ездзіць, галоўнае — каб была экзотыка: Гаваі, Пальма дэ Мальёрка, Егіпет і іншыя кірункі, дзе яны могуць пасмажыцца на сонцы. Але ёсць людзі, якія з'яўляюцца археолагамі па натуры: калі самі і не капаюць, то абавязкова нешта для сябе адкрываюць, перш за ўсё ў сферы культуры, мастацтваў. Я адношу сябе да той катэгорыі, якая жадае пазнаць: дык што ж пакаленні людзей пакінулі пасля сябе для нас, з чым мы павінны знаёміцца, чым мы павінны карыстацца? Паколькі я яшчэ займаюся жывапісам, то я не езджу нікуды без эцюднікаў і без матэрыялаў, на якіх гатовы адлюстраваць светлавую і дынамічную прыгажосць усяго, што бачу. І калі спытаць: што ж мне больш падабаецца? Я адкажу: мая малая радзіма, мая Століншчына, куды я кожны год езджу. Я лічу, што мы, беларусы, мала ведаем сваю краіну. Калі б ведалі лепш, то больш укладвалі б у тое, каб аднавіць дзівосы, якія нам пакінулі папярэднія пакаленні.

Ларыса ЦІМОШЫК.

■ Абітурыент-2012

Анатоль РУБІНАЎ:

«Ільготы не павінны быць галоўным аргументам пры залічэнні...»

Дзяржаўная камісія па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных выпрабаванняў ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі прапануе правесці восенню грамадскае абмеркаванне праекта новых правілаў прыёму, дапрацаваць іх і да 1 лістапада прадставіць на разгляд кіраўніка дзяржавы. Аб гэтым на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры паведаміў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыня дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам прыёмнай кампаніі Анатоль РУБІНАЎ.

— Сітуацыя, якая склалася сёлета падчас прыёмнай кампаніі, у чарговы раз даказала, што пытанні прадастаўлення пры паступленні льгот і далейшага захавання асобнага конкурсу для абітурыентаў з горада і сельскай мясцовасці патрабуюць перагляду. Напэўна, гэта не зусім правільна, калі пры залічэнні ў ВНУ «льготнікі» адбіраюць месцы ў больш падрыхтаваных абітурыентаў. Для прыкладу, у Беларускім дзяржаўным універсітэце на спецыяльнасць «Сацыяльныя камунікацыі» пры прахадным бале 364 па-за конкурсам былі залічаны 3 ільготнікі з кола дзяцей-сірот, якія набралі адпаведна 156, 208 і 296 балаў, — падкрэсліў Анатоль Рубінаў. — У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце пры паступленні на спецыяльнасць «Мытная справа» абітурыент, які набраў 318 балаў, быў вымушаны саступіць ільготніку, які меў толькі 170 балаў. Лічу, што гэта несправядліва, таму сітуацыю трэба выпраўляць...

Па словах старшыні дзяржаўнай камісіі, як і летась, адмоўны ўплыў на якасць адбору абітурыентаў аказвала правядзенне на шэрагу спецыяльнасцяў асобнага конкурсу паміж выпускнікамі сельскіх і гарадскіх устаноў адукацыі. Былі выпадкі, калі гараджане мелі перавагу перад абітурыентамі з сельскай мясцовасці да 100 балаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Мяркуем, што ільготы не павінны быць галоўным аргументам пры залічэнні, паколькі не можа быць інжынер ці ўрач менш кампетэнтным і прафесійным толькі з той нагоды, што пры паступленні ён карыстаўся тымі ці іншымі льготамі. Ільгатаванне не павінна тычыцца ведаў і здольнасцяў. Але падтрымка такіх людзей усё ж такі павінна быць: я маю на ўвазе абавязковае прадастаўленне ім месца ў інтэрнаце, выдачу льготнага крэдыту, адмену платы за ўдзел у ЦТ і гэтак далей, — дадаў Анатоль Рубінаў.

Таксама Анатоль Рубінаў звярнуў увагу на праблему залічэння пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд. Гэтыя абітурыенты, якія маюць права быць залічанымі без уступных іспытаў, пры паступленні на звышпрэстыжныя спецыяльнасці нярэдка выціскаюць абітурыентаў з вельмі высокімі баламі па выніках ЦТ. Скажам, у БДУ з 15 залічаных на спецыяльнасць «Міжнароднае права» 7 аказаліся пераможцамі алімпіяд. Затое не змаглі паступіць абітурыенты, якія набралі проста бліскучыя балы — 366 з 400 магчымых.

Старшыня дзяржаўнай камісіі падкрэсліў, што абгрунтаванасць залічэння пераможцаў алімпіяд у падобным выпадку выклікае сумненні. Адна справа, калі размова ідзе пра фізіку, хімію, матэматыку, біялогію: гэтыя прадметы вывучаюцца ў школе і іх пераможцы, што цалкам заканамерна, могуць быць залічаны без экзаменаў на адпаведныя спецыяльнасці ў ВНУ. Але «Міжнароднае права» ў школе не вывучаецца. А дысцыпліна «Грамадазнаўства», па выніках якой пераможцы рэспубліканскай алімпіяды паступаюць на факультэт міжнародных адносін, наўрад ці мае прамое дачыненне да будучай спецыяльнасці...

Надзея НІКАЛАЕВА

■

АБЗАЦ

◢ **Буйны груз алюмініевага сплаву затрыманы ў Лепельскім раёне. У аўтамабілі МАЗ-МАН з паўпрычэпам жыхар Віцебска перавозіў без суправаджальных дакументаў 20 т сплаву на Br340 млн. Груз затрыманы.**

◢ У Ваўкавыскім раёне праводзіцца праверка па факце гібелі машыніста бульдозера пасля сутыкнення з экскаватарам. Няшчасны выпадак здарыўся ў мелавым кар'еры. Згодна з папярэдняй версіяй, машыніст экскаватара пры павароце зачапіў бульдозер, што стаяў побач. Былі разбураны кабіна і бакі бульдозера. Для тушэння паліва, якое загарэлася, прыехалі пажарныя. Як мяркуецца, прычынай трагедыі з'явілася парушэнне тэхналагічнага працэсу пры распрацоўцы новага радовішча.

◢ **Упершыню за ўсю гісторыю правядзення сусветных чэмпіянатаў лесарубаў у трыццатых па ліку спаборніцтвах, якія стартавалі ўчора ў Мінску, прымае ўдзел жанчына. У юніёрскай групе (да 24 гадоў) ёсць дзяўчына з Люксембурга.**

◢ Следчы камітэт праводзіць праверку па факце гібелі мінчанина на лыжароллернай трасе. Мужчына 1971 г.н. катаўся на роліках на спецыяльнай трасе па праспекце Пераможцаў у Мінску. Згодна з папярэдняй версіяй, нечакана яму стала дрэнна, ён упаў і ўдарыўся галавой аб асфальт. Устаноўлена, што на здароўе чалавек не скардзіўся, вёў здаровы лад жыцця. Ён памёр да прыезду «хуткай».

ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **У Паўднёва-Афрыканскай рэспубліцы малады бегемот прабраўся на тэрыторыю прыватнага запаведніка, заскочыў у басейн і захрас там. Ніякага спосабу выбрацца ў яго не было. Каля басейна сабралася група экспертаў, якія доўга вырашалі, як вызваліць жывёліну з палону. Для пачатку плануецца асушыць басейн, усыпіць бегемота і падняць яго з дапамогай будаўнічага крана. Заолагі мяркуюць, што бегемот трапіў на тэрыторыю прыватнага запаведніка, уцякаючы ад варожа настроеных самцоў са свайго статка.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

БОЛЬШ ЗА ПАЛОВУ ЗАРЭГІСТРАВАНЫХ КАНДЫДАТАЎ — ПРАДСТАЎНІКІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прадстаўніцтва партый

Фактычна ў выбарах удзельнічае 8 (усяго іх 15) палітычных партый. Аграрная партыя прадстаўлена толькі адным кандыдатам, які не вылучаўся партыйна. Чатыры гады таму ў выбарах удзельнічала такая ж колькасць партый. Зараз, па словах **старшыні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ,** сярод палітычных партый па актыўнасці на першым месцы знаходзіцца Ліберальна-дэмакратычная партыя (больш за 70 кандыдатаў). Ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі — 35 кандыдатаў, гэта другое месца.

Чаму было адмоўлена ў рэгістрацыі?

«Раней мы паведамлялі, што 124-ом фізічным асобам было адмоўлена ў рэгістрацыі ў якасці кандыдата, — кажа кіраўнік ЦВК. — Па ўдакладненых звестках, гэтая лічба складае 122 чалавекі. А 9 патэнцыйных кандыдатаў самі добраахвотна знялі свае кандыдатуры (5 з іх з'яўляюцца прадстаўнікамі палітычных партый: 1 — Беларуская партыя левых «Справядлівы свет», 2 — Ліберальна-дэмакратычная партыя, 2 — Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці). Прычыны адмовы не былі пазначаны. А вось асноўная прычына адмовы ў рэгістрацыі з боку акруговых камісій — няпэўнасць подпісаў. «Зараз гэтыя подпісы вывучаюцца спецыялістамі ЦВК, і пасля будзе прымацца рашэнне аб тым, наколькі абгрунтавана дзейнічала акруговая камісія. Шмат адмоў было таксама ў сувязі з няпэўнасцю дэкларацыі аб даходах і маёмасці. Аднак тут таксама ўсё будзе правярацца. Я думаю, што, як мінімум, адзін чалавек будзе адноўлены, бо я ўбачыла, што органы рэгістрацыі зямельных участкаў валодаюць не вельмі дакладнай інфармацыяй, з-за чаго і была дапушчана памылка», — заявіла Лідзія Ярмошына. Дарэчы, разгляд скаргаў ЦВК пачне ў аўторак.

Ёсць безальтэрнатыўныя акругі

«На вялікі жаль, у нас зараз утварыліся чатыры безальтэрнатыўныя выбарчыя акругі. Адна — у Гродзенскай вобласці, адна — у Брэсцкай, дзве — на тэрыторыі Мінскай вобласці. У 2008-м такіх акруг было 16. Аднак яшчэ ніхто не ведае, якая карціна будзе на момант правядзення выбараў», — падкрэсліла старшыня ЦВК.

Назіральнікі

У ЦВК акрэдытавана 5 нацыянальных назіральнікаў. Свае дакументы накіравалі і ўжо атрымалі статус членаў ЦВК з правам дарадчага голасу па адным прадстаўніку ад сямі палітычных партый: Беларускай партыі левых «Справядлівы свет», Камуністычнай партыі Беларусі, Ліберальна-дэмакратычнай партыі, Партыі БНФ, Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада). Апроч таго, акрэдытавана 157 міжнародных назіральнікаў. Сярод іх 105 — ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў, ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) — 48. Ад Цэнтральнай выбарчай камісіі Расійскай Федэрацыі — 3. І адзін — ад ЦВК Рэспублікі Малдова.

Верагодная яўка выбаршчыкаў

«Згодна са звесткамі сацыялагічнай службы пры Адміністрацыі Прэзідэнта, яўка выбаршчыкаў на выбарах у сярэднім па краіне прагназуецца каля 67%. Але гэта інфармацыя ліпеня — а гэта не лепшы час для такіх даследаванняў. Таму я думаю, што яўка будзе, можа, і большай».

Колькі былых і цяперашніх дэпутатаў спрабуюць ізноў балатавацца?

У гэтых выбарах будзе ўдзельнічаць 21 дэпутат цяперашняга парламенту. «А калі ўзяць дэпутатаў усіх скліканняў, то ўсяго такіх 60 чалавек. Гэта тыя, хто ўжо калісьці быў дэпутатам ці ім зараз з'яўляецца. А значыць, 1/6 частка ўсіх кандыдатаў — гэта дэпутаты розных скліканняў».

Дэпутаты пастарэлі

«Мне здаецца, што наш кандыдат стаў старэйшым. Раней моладзі да 30 гадоў, асабліва на першасным ўзроўні, было больш. Зараз жа асноўны ўзрост — ад 30 да 50 гадоў», — паведаміла Лідзія Ярмошына.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

НЕКАЛЬКІ АРГУМЕНТАЎ НА КАРЫСЦЬ РОСТУ ЗАРПЛАТЫ

Наш карэспандэнт абмяркоўвае праблематыку павышэння даходаў насельніцтва з вядомым эканамістам, доктарам навук, прафесарам, акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Пятром Нікіценкам.

— Пётр Георгіевіч, памятаеце, як год таму нечакана «выбухнуў» нездаровы ажыятажны попыт на замежную валюту, узніклі чэргі каля абменных пунктаў, «чорны» рынак валюты, панічныя чуткі і г. д. Сёння стабілізацыя дасягнута. Што далей? Якія высновы і ўрокі трэба зрабіць з нагоды леташніх падзей?

— Дзякуй Богу, той непрыемны перыяд адносна хутка скончыўся і мы зараз жывём ва ўмовах макраэканамічнай стабільнасці. Гэта добра. Аднак, павінен заўважыць, што адмоўны досвед — гэта таксама карысны досвед. Леташнія падзеі на фінансава-грашовым рынку яшчэ раз пацвердзілі тэзіс аб тым, што нам, як краіне з экспартаарыентаванай вытворчасцю, трэба імкнуцца жыць па законах і правілах сусветнай эканомікі. А там не ўсё прыгожа і прыстойна. Там, на жаль, ёсць месца такім негатыўным з'явам, як спекуляцыйны фіктыўны капітал, дзякуючы якому квітнее ўся фінансавая алігархія; несумленныя гульні на біржах; нябачны, але адчувальны ўплыў буйных міжнародных спекулянтаў са шматмільярдным сумамі долараў на ход спраў на глабальным фінансавым рынку — у прыватнасці, на ваганні валютных курсаў, іх наўмыснае штучнае паніжэнне ці павышэнне, нават яе дыскрэдытацыю.

Трэба не забываць, што амерыканцы дзякуючы даларызацыі сусветнай эканомікі ўжо не адно дзесяцігоддзе паспяхова здымаюць фінансавую маржу на сваю карысць, як, дарэчы, і прысвойваюць прыродную рэнту ўсёй планеты незалежна ад таго, дзе знаходзяцца запасы нафты і газу — у Расіі ці Лацінскай Амерыцы. Дзякуючы такой спекуляцыйнай схеме амерыканскія дзялкі эксплуатуюць таксама і чалавечыя рэсурсы.

Так, калі б Беларусь працавала, як у савецкія часы, па законах закрытай эканомікі, то можна было б у пэўнай ступені ігнараваць тое, што адбываецца за яе межамі. А мы, як вядома, краіна з вялікай ступенню адкрытасці эканомікі. Гэта надае асаблівую важнасць нашаму ўменню працаваць па планетарных эканамічных законах. І тут у нас няма альтэрнатывы. Мы вымушаны, як бы нам гэта ні падабалася, падкормліваць даларызацыю, падтрымліваць і прыстасоўвацца пад іншыя пісаныя і няпісаныя правілы існавання ў глабальным эканамічным парадку. І гэта адзін з галоўных урокаў мінулага года. А таму ўсе тыя меры, якія прымаў урад па ліквідацыі леташніх узрушэнняў на валютным рынку, зніжэнні адмоўнага знешнегандлёвага сальда, скарачэнні імпартаёмістасці валавога ўнутранага прадукту, у цэлым адпавядаюць патрабаванням жыць ва ўмовах сусветнай эканомікі.

— Як гэта будзе суадносіцца з павышэннем узроўню жыцця насельніцтва краіны — у прыватнасці, павышэннем зарплаты? Бо прадстаўнікі вядучых міжнародных фінансавых структур летась раілі нам замарозіць зарплаты і пенсіі, бо, маўляў, нашы людзі зноў кінуцца скупляць долары і справакуюць новы валютны крызіс. Ваша меркаванне?

— Абсалютна не згодны з такой пастаноўкай пытання прадстаўнікамі Сусветнага банка і Міжнароднага валютнага фонду. Не буду паглыбляцца ў тэорыю пытання. Адзначу толькі, што невысокая зарплата пагражае непрыемнымі наступствамі. У прыватнасці, яна напрамую звязана з вымываннем працоўных рэсурсаў з краіны ў бліжняе замежжа. Асабліва будаўнікоў, праекціроўшчыкаў, праграмістаў, таленавітых менеджараў. Тых спецыялістаў, якія запатрабаваны ў Расіі, Польшчы, Прыбалтыцы. І сёння, на жаль, нямала моладзі і людзей сярэдняга ўзросту за дастойнай зарплатай едзе за мяжу, працуе на эканоміку іншых краін. Што атрымліваецца? Хлопец у нас атрымаў адукацыю ў прафесійна-тэхнічным вучылішчы, тэхнікуме ці ВНУ, набыў працоўны досвед (скажам, на будоўлі) і потым у самы актыўны перыяд свайго жыцця з'язджае з радзімы на заробкі.

Калі мы будзем замарожваць зарплату, пенсіі, іншыя сацыяльныя выплаты, то з кім мы застанёмся? Таму Прэзідэнт краіны ставіць задачу паступова ўзняць сярэднюю зарплату да 500 долараў у эквіваленце. І ён, дарэчы, правільна заўважыў, што і гэта не вельмі вялікія грошы. Трэба імкнуцца рухацца далей — да сярэдняй зарплаты ў 1000 долараў да канца пяцігодкі.

— І як, на ваш погляд, гэта рэальна?

— Рэальна. Але для гэтага, у прыватнасці, давядзецца грунтоўна ўдасканаліць нашу грувасткую падатковую сістэму. Напрыклад, у зніжэнні падатковай нагрузкі тоіцца значны рэзерв для росту зарплаты. Хатнія гаспадаркі, малы бізнэс павінны стаць асновай вядзення усяго нашага гаспадарчага жыцця. Нам трэба будзе хутчэй уводзіць у эканоміку, фінансавы абарот назапашанае нацыянальнае багацце, у тым ліку зямлю, лясныя і водныя рэсурсы, карысныя выкапні, выгаднае геаграфічнае становішча транзітнай краіны. А для гэтага ў пэўным сэнсе выкарыстаць лепшыя практычныя напрацоўкі так званай эканамічнай рэформы былога кіраўніка ўрада СССР А. М. Касыгіна. Тады, нагадаю, удалося істотна палепшыць эканамічную сітуацыю ў краіне.

— А як наконт грашовай эмісіі? Яна, паводле меркавання асобных эканамістаў, з'яўляецца адным з фактараў дэстабілізацыі на грашовым рынку Беларусі, рэзкіх ваганняў валютных курсаў.

— Прабачце, але тое, што вы кажаце, — гэта рэцыдыў старога мыслення, наступствы якога яшчэ моцна ўплываюць на нашы паводзіны і рашэнні ў грашова-фінансавай сферы. Давайце паглядзім на іншыя краіны. ЗША можна займацца эмісіяй? Кітаю можна займацца эмісіяй? Расіі, Японіі і іншым можна займацца эмісіяй? Значыць, усім эканамічна развітым краінам можна займацца эмісіяй, а Беларусі нельга. Чаму? Гэта несправядліва.

Калі мы не будзем рэгулярна ўключаць станок па друкаванні грошай, то мы не выйдзем на запланаваныя паказчыкі росту зарплаты. Акрамя гэтага, аналіз эканамічнага становішча за першае паўгоддзе паказвае, што ў нас нізкі ўзровень манетызацыі нацыянальнай эканомікі. Ці, інакш кажучы, у ёй мала беларускіх грошай, іх стане больш, калі ўсе разлікі ўнутры краіны будуць весціся толькі ў беларускіх рублях. Яшчэ адзін аргумент на карысць павышэння зарплаты — рост цэн на камунальныя паслугі, прадукты харчавання, тавары паўсядзённага попыту. Урад не можа не рэагаваць на гэта. У прыватнасці, прапаную цэны захоўваць рынкавыя, але пры гэтым рэгістраваць іх у нейкім дзяржаўным органе — напрыклад, у падатковай службе.

Мушу падкрэсліць, што ўся сусветная фінансавая сістэма інфляцыйная, эмісійная. На мой погляд, каб не было ажыятажнага попыту на валюту, трэба людзям прадаставіць іншыя магчымасці (акрамя назапашвання замежнай валюты) і спосабы захавання зберажэнняў — скажам, набываць прыбытковыя акцыі, зямельныя ўчасткі, нерухомасць.

— Вернемся да працоўнай міграцыі. Як ва ўмовах Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана, дзе вітаецца свабоднае перамяшчэнне працоўнай сілы, пераканаць маладога кваліфікаванага беларускага спецыяліста застацца дома, калі ў той жа Расіі яму за тую ж работу прапануюць у 2-3 разы больш грошай?

— Сёння запаволіць працоўную міграцыю можна толькі эканамічнымі метадамі. Наспеў час мяняць структуру эканомікі. Яна была ў асноўным сфарміравана ў савецкія часы і кардынальна мала змянілася за апошнія гады. Мы шмат гаворым аб неабходнасці павелічэння долі сферы паслуг у стварэнні валавога ўнутранага прадукту і недастаткова робім для гэтага. Прычым не такіх традыцыйных у нашым разуменні паслуг, як рамонт абутку і складанай бытавой тэхнікі, а паслуг адукацыйных, медыцынскіх, навукова-даследчых, турыстычных і г.д. Мы часам за малыя грошы ці ўвогуле бясплатна дорым іншым нашы ідэі, цікавыя арыгінальныя прапановы. Гэтым нярэдка карыстаюцца міжнародныя дзялкі накшталт сумнавядомага амерыканца Сораса, які з вялікай выгадай для сабе за мноства дробных грантаў (у сярэднім 500 долараў кожны) сабраў на абсягах былога СССР шмат стратэгічна важнай інфармацыі для свайго бізнэсу.

— Але што трэба зрабіць, каб фінансавая стабілізацыя не ператварылася ў застой?

— Нягледзячы на тое, што мы дасягнулі станоўчых зрухаў у эканоміцы, пэўнай макраэканамічнай стабілізацыі, нам не варта супакойвацца. Пачатая год таму работа па стабілізацыі патрабуе працягу і карэкціроўкі. Пэўныя здабыткі не даюць нам магчымасці хутка рухацца наперад — у прыватнасці, адразу істотна ўзняць сярэднюю зарплату ў краіне. А роля і значэнне зарплаты выходзяць за рамкі яе галоўнага паняцця як асноўнай крыніцы даходаў для пераважнай большасці насельніцтва Беларусі. Яна, зарплата, — паказчык паспяховасці асобы ў грамадстве, эфектыўнасці ў гэтай сферы дзейнасці, аўтарытэту ў сям'і. Калі ў чалавека нізкая зарплата, то адпаведныя да яго будуць і адносіны. З іншага боку, работнік з нізкай зарплатай не хоча працаваць у поўную сілу.

Давайце не трымацца за састарэлыя падыходы ў вырашэнні наспелых праблем, а працаваць крэатыўна. У нашым выпадку я маю на ўвазе стварэнне дадатковых стымулаў пры жаданні больш зарабляць афіцыйна і легальна. У нас яшчэ шмат «чорнага налу» ў розных формах, «шэрых» схем у разліках за паслугі, практыкуецца выплата часткі зарплаты ў канвертах. Таму варта мяняць тарыфныя сеткі.

Мы чамусьці далёка не заўсёды задумваемся над тым, што людзі з малымі заробкамі з'яўляюцца тормазам развіцця айчыннай эканомікі. Таму я разумею заклапочанасць кіраўніцтва дзяржавай гэтай сітуацыяй. Бо за вырашэнне якой праблемы мы б ні ўзяліся, абавязкова ў той ці іншай ступені сутыкнёмся з неабходнасцю павышэння зарплаты. Будзем спадзявацца, што ў нас працэс яе росту будзе няўхільным і пастаянным. І вельмі добра, што гарантам гэтага з'яўляецца Прэзідэнт Беларусі.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА

■

■ Фінансавы тыдзень

«ЕЎРАПЕЕЦ» ПАТАЎСЦЕЎ

І ажно на 1,7%. За гэты тыдзень курс еўра вырас адносна нацыянальнай валюты на 170 рублёў да 10450. Аднак еўра ўмацаваў свае пазіцыі і адносна долара.

На сусветных таргах долар стаў таннець адносна еўра. Усё гэта выклікана тым, што ў Амерыцы праблемы нарастаюць, і пачынаюць з'яўляцца чуткі аб радыкальных захадах. Калі падобныя заявы з боку еўрапейскіх кіраўнікоў павысілі давер да еўра, то ў выпадку са Злучанымі Штатамі атрымаўся адваротны вынік. Усіх вельмі насцярожвае той факт, што адной з галоўных эканомік свету хутка можа спатрэбіцца значная дапамога. Таму долар падняўся толькі на 30 рублёў (плюс 0,4%) да 8340. Расійскі рубель дадаў 1 наш рубель (плюс 0,4%) і цяпер каштуе Br262.

НАЦБАНК ПАВЫШАЕ НАРМАТЫВЫ РЭЗЕРВОВЫХ ПАТРАБАВАННЯЎ

Для банкаў і небанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый павялічаны з 10% да 12% нарматывы абавязковых рэзерваў ад прыцягненых рэсурсаў у замежнай валюце. Гэта робіцца для садзейнічання ў дасягненні мэтавага ўзроўню інфляцыі і дэдаларызацыі эканомікі. Новыя нарматывы будуць прымяняцца, пачынаючы з разліку рэзервовых патрабаванняў за жнівень 2012 года.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

НОВЫЯ ГОРКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У новым інтэрнаце будуць жыць студэнты з трох факультэтаў: міжнародных сувязяў, эканамічнага, бізнэсу і права, — пракаментаваў **рэктар БДСГА Аляксандр КУРДЗЮКА**. — Менавіта на гэтых факультэтах у нас вучыцца шмат замежнікаў.

Ва ўрачыстым адкрыцці новага інтэрната браў удзел кіраўнік урада Беларусі Міхаіл Мясніковіч. Цяпер на будынак наводзяць канчатковы лоск: навокал завяршаецца добраўпарадкаванне, памяшканні прыбіраюць, ліквідуюць дробныя недапрацоўкі, правяраюць усе сістэмы.

У акадэміі гавораць, што пытанне аб пабудове новага інтэрната стаяла на парадку дня не адзін год, але дзякуючы «Дажынкам-2012» і падтрымцы дзяржавы яго рэалізавалі ў сціслыя тэрміны. Адметна, што ў будаўніцтве актыўна бралі ўдзел студэнцкія атрады. Выкладчыкі і студэнты лічаць, што новы інтэрнат стаў упрыгажэннем Акадэмгарадка і раённага цэнтра.

Між тым, у Горках адкрываюцца новыя аб'екты. Напрыклад, абноўлены кінатэатр «Крыніца» з 3D-сістэмай, дзіцячы парк, адрамантавана школа. Сёння ў Горках урачыста адкрыецца Лядовы палац.

Увогуле да рэспубліканскага свята працаўнікоў сяла пабудуюць і мадэрнізуюць каля 250 самых розных аб'ектаў. Сярод іх — моладзевы забаўляльны комплекс з амфітэатрам на тэрыторыі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, дзе будуць праходзіць асноўныя мерапрыемствы «Дажынак-2012».

Ілона ІВАНОВА.

СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА Ў МІНСКУ НАБЛІЖАЕЦЦА ДА 5 МЛН РУБЛЁЎ

Сярэдняя зарплата ў Мінску ў ліпені дасягнула Br4 млн 962 тыс., паведаміла прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кандраценка.

На другой пазіцыі сярод рэгіёнаў па ўзроўні сярэдняй заработнай платы ў ліпені — Мінская вобласць (Br4 млн 2,5 тыс.), на трэцяй — Гомельская вобласць (Br3 млн 760,5 тыс.). Ліпеньская сярэдняя зарплата ў Магілёўскай вобласці складала Br3 млн 639 тыс., у Віцебскай — Br3 млн 543,2 тыс., у Гродзенскай — Br3 млн 534,5 тыс., у Брэсцкай вобласці — Br3 млн 429,4 тыс.

Лідарам сярод рэгіёнаў Беларусі па росце рэальнай заработнай платы з'яўляецца Гомельская вобласць. Так, рэальная заработная плата ў студзені—ліпені 2012 года да ўзроўню студзеня—ліпеня 2011-га тут склала 113,7 працэнта. Паводле аператыўных статыстычных даных, на другім месцы па тэмпе росту рэальнай заработнай платы ў студзені—ліпені 2012 года да студзеня—ліпеня 2011-га — Мінская вобласць (113,4 працэнта), на трэцім — Магілёўская вобласць (111 працэнтаў).

Як адзначылі ў Белстаце, самая высокая сярэдняя заработная плата ў ліпені зафіксавана па такіх відах эканамічнай дзейнасці, як дзейнасць, звязаная з вылічальнай тэхнікай, — Br9 млн 522,9 тыс., вытворчасць коксу, нафтапрадуктаў і ядзерных матэрыялаў — Br8 млн 274,6 тыс., паветраны транспарт — Br7 млн 36,6 тыс.

Самы нізкі гэты паказчык у ліпені быў у работнікаў такіх відаў эканамічнай дзейнасці, як прадастаўленне сацыяльных паслуг (Br2 млн 510,5 тыс.), адукацыя (Br2 млн 704,2 тыс.), дзейнасць, звязаная з кіна- і відэафільмамі (Br2 млн 810,9 тыс.), цеплазабеспячэнне (Br2 млн 842,7 тыс.), рамонт бытавых вырабаў і прадметаў асабістага карыстання (Br2 млн 882,7 тыс.).

Максімальны тэмп росту рэальнай заработнай платы ў студзені—ліпені 2012 года да ўзроўню студзеня—ліпеня 2011-га забяспечаны на вытворчасці коксу, нафтапрадуктаў і ядзерных матэрыялаў (133,4 працэнта), рамонце бытавых вырабаў і прадметаў асабістага карыстання (128,6 працэнта), на чыгуначным (126 працэнтаў) і паветраным (125,6 працэнта) транспарце. Мінімальны гэты паказчык — у галіне архітэктуры, інжынерных паслуг (84,5 працэнта), воднага транспарту (89,5 працэнта) а таксама ў галіне радыёвяшчання і тэлебачання (92 працэнты), апрацоўкі другаснай сыравіны (97,3 працэнта).

У цэлым па прамысловасці рэальная заработная плата ў студзені—ліпені гэтага года ўзрасла да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года на 13,6 працэнта, у рабочых і служачых — на 10,3 працэнта.

БЕЛТА.

«Мой родны кут, *Як ты мне мілы!»,*

— згадаў вядомыя радкі паэта беларускі бізнэсмен Юрый Чыж і назваў будучы турысцкі комплекс «Наш родны кут Сабалі». Менавіта ў вёсцы Сабалі Бярозаўскага раёна неўзабаве будуць узведзены гасцініца, рэстаран, этнаграфічны музей, аўтастаянка, лыжароллерная траса і іншыя аб'екты разам з усёй неабходнай інжынернай і транспартнай інфраструктурай.

Асноўнымі інвестарамі праекта выступяць ААТ «Трайпл», а таксама фірмы «Варыянт», «НафтаХімТрэйдынг». Зараз падбіраюцца генеральныя падрадчыкі і праектныя арганізацыі. Рыхтуюцца дакументы на перадачу ў арэнду 330 гектараў зямлі тэрмінам на 99 гадоў. Так, браты Юрый і Аляксандр Чыжы, якія валодаюць вышэйназванымі прадпрыемствамі, дадуць новае жыццё сваёй малой радзіме. «Наш родны кут Сабалі» зойме тэрыторыю паміж самой вёскай і аўтамабільнай дарогай Брэст — Масква. І можна разлічваць на тое, што турысцкі комплекс будзе запатрабаваны не толькі турыстамі, але і падарожным людам.

Яна СВЕТАВА.

■ Твае выхадныя

АПОШНЯЕ ЛЕТНЯЕ «ЭТНА»

Каму падасца мала «Вольнага паветра» ў суботу, то ёсць магчымасць працягнуць у нядзелю. Толькі пераехаць у Дудуткі, дзе на закрыццё летняга сезона падрыхтавалі фестываль «Этна Млын», які пачнецца апоўдні.

Жнівень — месяц трох вялікіх хрысціянскіх свят. Тры святы — калі можна радавацца новаму мёду, ураджаю яблык ды наогул усяму, што, дзякуй Богу, нарасло ў гародзе, ды кветкам як увасабленню прыгажосці Боскага свету.

Дык чаму ж не сумясціць прыемнае з карысным? І пакаштаваць прысмакаў, якімі збіраюцца пачаставаць гасцей у Дудутках, — мёду, арэхаў, яблыкаў... Ды сёе-тое адкрыць для сябе з мінулага жыцця-быцця тых людзей, для якіх калісьці першаснай была сутнасць свят, а не іх атрыбуты. Яны былі багатыя — бо ўмелі шмат і шмат маглі. Што ўмелі — пакажуць майстры, якія валодаюць народнымі рамёствамі сёння: ганчары, кавалі. Але каб змаглі і мы — можна будзе павучыцца літаральна на месцы, паспрабаваўшы сёе-тое зрабіць сваімі рукамі.

Але ж разам са справай нам трэба нанаў вучыцца адпачываць, як калісьці — спяваць і танчыць. І такая магчымасць будзе: этна-гурт «GUDA» пакажа і навучыць. А для гурманаў беларускага «этна» — «Троіца». Такога зашмат не бывае, тым больш ва ўмовах, набліжаных да натуральных. І ўсю радасць адразу можна атрымаць за адзін уваходны квіток у комплекс.

Ларыса ЦІМОШЫК

■

ЧУП «Центр исследования институтов рынка» ИЗВЕЩАЕТ: О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Широкая, 4в

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена лота, без НДС, руб.	Задаток 10%, без НДС, руб.
1	2	3	4
1	Трансформатор ТСМА 100/10	8 400 000	840 000
2	Бытовка металлическая	5 760 000	576 000

Организатор торгов – ликвидатор ЧУП «Центр исследования институтов рынка» ЧУП «Юриспрудент».

Продавец – ЧУП «Центр исследования институтов рынка».

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.00: г. Гомель, ул. Широкая, 4в.

Задаток перечисляется до 07.09.2012 г. (включительно), на р/с 3012511380025 в ЦКО №3 Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК 153001739, УНН 490317459.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 7 рабочих дней после подписания протокола и возместить затраты на проведение торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления до 15:00 07.09.2012 года по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5, ком. 3.

Дата, время, место проведения открытого аукциона 10.09.2012 года в 15.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5, ком. 3.

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества обращаться по телефону: (8029) 698 07 48.

Наш культурны асяродак

Жыроандоля

Выпуск № 27 (156)

Наша Вавілонская вежа

Такі інавацыйны супольны спектакль ствараюць удзельнікі летняй тэатральнай школы.

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі прапануе яго паглядзець 30 і 31 жніўня. Але глядзець — мала. Таму што сцэны яму мала. Эксперымент жа, аднак, што ствараецца сіламі ўдзельнікаў інавацыйнай Міжнароднай тэатральнай школы, якая гэтымі днямі працуе ў Мінску. А калі эксперымент, то гэта значыць, што ўсю прастору тэатра яму трэба аддаць. Вавілонская вежа — нешта ж маштабнае, шматузроўневае, дзе ёсць патаемныя сходы і нечаканыя пляцоўкі для тых, каму трэба перадыхнуць, каб уздымацца ўверх. Вось спектакль гэты павінен атрымацца менавіта такім — каб па ім можна было падарожнічаць гледачу і каб кожны чалавек мог адкрыць для сябе ў гэтай тэме нейкі новы ўзровень ці патаемны куток. Інакш кажучы, глядач — той жа артыст ці стваральнік у гэтым спектаклі, і той, хто збіраецца на гэта паглядзець, ужо цяпер павінен рыхтавацца да сустрэчы з новым тэатрам.

Эксперыментаў у беларускім тэатры сёння — адзінкі. Але асобы, якія любяць спрабаваць нешта новае, ёсць — і працуюць яны падчас у самых «акадэмічных», з трывалымі традыцыямі тэатрах. Адна з іх — Вольга Кастэль, балетмайстар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра Беларусі. Менавіта яна стала мастацкім кіраўніком праекта летняй тэатральнай школы, дзе вучаць разумець іншы тэатр.

Быць ці не быць — не пытанне для тэатра. Якім быць? Вось у чым пытанне. Адказы на яго шукае для сябе кожны творца — драматург, рэжысёр, акцёр. Але часам ім трэба дапамагчы. Дзеля гэтага абмену думкамі пра сучасны тэатр і была арганізавана Міжнародная тэатральная летняя школа Supemeda, якую падтрымала Міністэрства культуры Беларусі. Якраз напярэдадні адкрыцця сезона, у апошнюю дэкаду жніўня, школа сабрала беларускіх рэжысёраў, драматургаў, акцёраў, медыя-дызайнераў з розных краін Заходняй Еўропы, якія ад традыцыйных тэатральных формаў ідуць да тэатра новых ідэй і тэхналогій. На гэтым шляху накіроўваць тэатральных эксперыментатараў будуць кураторы са Швейцарыі, Германіі і Беларусі. Але веды — адно, а іх рэальнае прымяненне — зусім іншае. Спектакль на тэму «Вавілонская вежа» — гэта практычнае ўвасабленне тых думак, якімі дзяліліся адзін з адным удзельнікі школы ў выглядзе эцюдаў, якія ствараліся самі. Вольныя па змесце, жанры і форме, аб'яднаныя разам, яны, як цаглінкі, складуць нейкую маштабную канструкцыю, для якой нават мала сцэны. І гледача, які чакае, што яму ўсё пакажуць і падрабязна патлумачаць, — таксама мала. Цяпер і глядач — частка агульнай дзеі. І калі яшчэ не ўсе да гэтага гатовы, то якраз падобныя праекты — школа для выхавання сучаснага тэатральнага гледача з інавацыйнай свядомасцю, які не проста спажывае мастацкі прадукт, але саўдзельнічае.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Феномен Уладзіміра Гніламёдава

Падчас працы ў Інстытуце літаратуры НАН Беларусі Віктар Антонавіч Каваленка прапанаваў мне напісаць для «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя» раздзел пра творчасць В. Коўтун. Пачаўся звычайны працэс: перачытванне паэтычных кніжак аўтара, знаёмства з крытычнай літаратурай. І мне патрапіла ў рукі кніга У. Гніламёдава «Сучасная беларуская паэзія. Творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс» (1983). Кніга мяне ўразіла. Наколькі тонка і пранікнёна бачыў даследчык мастацкі свет паэтаў. Глыбока разумеў філасофію твораў, заўважаў дэталі, найтонкія адценні, фарбы. Слова яго было лёгкім і зразумелым і, разам з тым, навукова адказным, аргументаваным.

ЦЯПЕР я ведаю, што гэтай манаграфіі папярэднічаў шэраг іншых грунтоўных манаграфічных прац («Лірычны летапіс часу», «Сучасная беларуская паэзія», «Традыцыі і наватарства», зборнікі літаратурна-крытычных артыкулаў. Пасля былі іншыя сур'ёзныя працы: «Ля аднаго вогнішча», «Класікі і сучаснасць», «Праўда зерня: творчы партрэт Васіля Зуёнка», «Янка Купала: новы погляд», і г.д. Можна сказаць, акадэмік У.Гніламёдаў напісаў сваю адметную гісторыю беларускай паэзіі XX стагоддзя. Ён стаў сапраўдным аўтарытэтам для многіх навукоўцаў і шматлікай арміі студэнтаў-філолагаў. Толькі, нягледзячы на ўсё гэта, яму ўвесь час карцела выйсці за межы «чыстай» навукі, заняцца пісьменніцкай працай, карцела звярнуцца да сваіх каранёў, да сакральнага — гісторыі свайго роду, сваёй малой радзімы.

У. Гніламёдаў распачаў маштабную працу, фармальна абазначыўшы яе як «Сямейная хроніка ў духу барока».

Першы раман **«Уліс з Прускі»** з'явіўся ў 2000 годзе. Ён прысвечаны амерыканскай адысеі галоўнага героя «Хронікі» Лявона Кужаля і закранае канец XIX—пачатак XX стагоддзя. (Асобным выданнем твор выйшаў у 2006 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», а ў 2007 годзе быў адзначаны прэміяй «Залаты Купідон».) Другі раман **«Усход»** храналагічна звязаны з падзеямі Першай сусветнай вайны, бежанствам, рэвалюцыяй, грамадзянскай вайной. Ён друкаваўся на працягу 2003—2005 гадоў у часопісе **«Полымя»**. Асобнай кніжкай, але ўжо пад назвай **«Расія»**, ён выйшаў у 2007 годзе. У тым жа «Полымі» на працягу 2006—2008 гадоў друкаваўся і трэці раман цыкла — **«Вяртанне»** (асобна выйшаў у 2008 годзе). Тут аўтар адлюстроўвае няпростую сітуацыю 1920-х гадоў у Заходняй Беларусі. У чацвёртым рамане **«Валошкі на мяжы»** (Полымя, 2009 — 2011 гг.) паказана далейшае развіццё падзей на Берасцейшчыне: 1930-я і пачатак 1940-х гадоў, калі на змену ўлады палякаў прыйшла савецкая ўлада. Польская каланіяльная сістэма саступіла месца бальшавіцкаму дыктату. У чэрвеньскім нумары часопіса «Полымя» сёлета распачата публікацыя чарговага рамана **«Ліхалецце»**, дзе закранаюцца ўжо падзеі Айчыннай вайны 1941—1945 гг.

У. Гніламёдаву, як і Марселю Прусту ў яго геніяльнай працы «У пошуках страчанага часу», было вельмі важна перадаць **сваё адчуванне** радзімы, **сваё** адчуванне часу, гісторыі праз сукупнасць **адчуванняў** сваіх продкаў, землякоў, праз сукупнасць фактаў чалавечага перажывання ўвогуле. Як і Прусту, У. Гніламёдаву было невыносна цяжка, што свет, які ён адчувае, носіць у сабе, знікне, сыдзе ў нябыт разам з ім. Знікне яго Пруска, яго эпоха, яго гісторыя, а разам з імі — і тыя глыбінныя духоўныя каштоўнасці, носьбітамі якіх яны з'яўляюцца. Адсюль і адна з галоўных задач пісьменніка — адлюстраваць жыццё роднай вёскі Прускі, у якой нараджаліся і жылі яго продкі, адкуль пайшоў ён сам.

Сувязь з эпічнымі традыцыямі К. Чорнага, І. Мележа, І. Чыгрынава (да гэтых творцаў-эпікаў можна далучыць і рускага пісьменніка М. Шолахава, аўтара «Ціхага Дона») відавочная. Яна — у глыбіні быційнага адлюстравання, у канцэптуальным вырашэнні чалавека наогул і чалавека **гэтага**, у непарыўнай повязі лакальнага, індывідуальна-непаўторнага **свайго** «дома», з «домам» **нацыянальным**, а праз яго — з **агульначалавечым** прыродным «домам».

У «Хроніцы» дамінуе калектыўнае «мы» вяскоўцаў. І не толькі прускаўцаў. У рамане «Расія» да іх далучаюцца і галасы запалонцаў — галасы рускага народа. Гэтае «ўзбуйненае» калектыўнае «мы» сінтэзуе «хоры» двух славянскіх народаў.

Гніламёдаву-раманісту XXI стагоддзя ўдалося найбольш глыбока спасцігнуць драматычную сутнасць сацыяльных, духоўных перамен першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя, маштабна адлюстраваць унутраную драму беларускага народа.

Галоўны герой «Хронікі» Лявон Кужаль — вобраз-тып, які па сваёй анталагічнай сутнасці стаіць упоравень з коласаўскім Міхалам і мележаўскім Васілём Дзятлікам. Менавіта стаўленне да зямлі вызначае характар і сацыяльную пазіцыю гэтых герояў. Лявон сваё жыццё і сваю будучыню таксама звязвае з працай на зямлі. І менавіта на зямлі сваіх продкаў. Ён душою адчувае *«прыемнае цяпло зямлі»*, яе жыццядайную сілу, а між тым лёс штурхаў яго па іншых жыццёвых сцяжынах. Герой хацеў проста жыць. Як жыў яго дзед Кірыла, як жылі прускаўцы, увесь беларускі народ. Жыць на сваёй зямлі і ў сваім доме — канкрэтным бацькоўскім доме. Вобразы зямлі і бацькоўскага дома ў прозе У. Гніламёдава насычаюцца глыбокім філасофскім зместам і набываюць статус архетыпаў нацыянальнага дома. Яны трансфармуюцца ў абагульнены вобраз радзімы.

Лявон Кужаль хацеў жыць сваім, «зямельным» інтарэсам, сваім домам, сваёй сям'ёй. *«Толькі зямля дазваляе жыць сумлення. Калі яе даглядаць. Калі думаць пра яе»*.

З паняцця зямлі «вырастае» паняцце радзімы. Радзіма — гэта не толькі дом, сям'я, вёска, блізкія людзі. Радзіма для героя У. Гніламёдава — гэта яшчэ і зямля яго продкаў, і яго зямля, — расквечаная фарбамі і гукамі. А яшчэ — гэта пах чабору. Гніламёдаўскі вобраз чабору нібыта перагукаецца з багдановічаўскім вобразам валошкі.

Трагічны матыў вобраза Лявона, заяўлены ў першых дзвюх кнігах «Хронікі», у рамане «Вяртанне» прасвятляецца верай у чалавека, яго жыццядайную сілу. Лінія развіцця вобраза Лявона Кужаля падкрэслівае настойлівую неабходнасць самабытнага ўдзелу чалавека ў стваральным жыцці. У гэтым пісьменніку бачыцца яго, чалавека, выратаванне і яго свабода. Усё, аб чым раней марыў герой у сваіх «блуканнях па пакутах», здаецца, збылося. Ён збудаваў сабе дом, займеў добрую гаспадарку, нават малатарню рыдбаў, а галоўнае, купіў зямлі ў Пацаў, стаў заможным гаспадаром. *«Жыццё ішло сваім ходам»*.

Вобраз Лявона 1920-х—1930-х гадоў — гэта сцвярджэнне ідэі захавання ўнутранага «я» беларуса, яго нацыянальнага «дома», захавання пераемнасці духоўнага ладу жыцця.

Але вось надышло лета 1939 года. У Пруску прыйшла Чырвоная Армія, а ўвосень Народны сход у Беластоку абвясціў Савецкую ўладу на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі. Вясной 1940 года ў маёнтку пана Падгурскага пачалася арганізацыя камуны. ***«Свет страціў ранейшы свой парадак...»***.

Лявон 1940-х гадоў — гэта ўжо матыў страчанасці спрадвечных духоўных сувязяў паміх людзьмі, паміж чалавекам і «домам». Трагедыя Лявона яшчэ і ў тым, што ён стаў апошнім з магікан сялянскага роду Кужаляў. Яго вялікая радасць у жыцці — Васятка, які нарадзіўся не яго сынам, але стаў яму родным, падаўся ў горад, здрадзіў не толькі вёсцы, але і яму, Кужалю, — бо адмовіўся ад яго прозвішча, вярнуў сабе расейскае, па бацьку — Платонаў.

Сялянскі род Кужаляў перарываецца...

У раскрыцці духу народа В.Бялінскі бачыў прыкметы эпапеі. У цэнтр свайго адлюстравання У. Гніламёдаў «паставіў» дух *«стомленага народа»*, якому *«надакучыла думаць пра будучыню, ён даўно ўжо адвык ад гэтага занятку. Проста — жыў, па інерцыі»*.

У мастацкай канцэпцыі У. Гніламёдава вобразы герояў у мініяцюры мадэлююць працэсы інтэграцыі і дыферэнцыяцыі ў народным асяроддзі складаных сацыяльных працэсаў канца XIX і першай паловы XX стагоддзя. Разам з тым, пісьменнік у сваіх тэкстах індывідуальна-непаўторнае імкнецца дапоўніць, заглыбіць да больш агульнага. Акрэсліваюцца характэрныя сацыяльныя тыпы сялян — ад зусім бедных да заможных, — якія сфарміраваліся ва ўмовах вясковай рэчаіснасці, з улікам спецыфічнага нацыянальнага каларыту. Праз нацыянальнае пісьменнік звязвае сваіх герояў не толькі з пэўнай геаграфічнай прасторай, але і з духоўнай гісторыяй, духам продкаў. Такі Лявон Кужаль, дзед Кірыла, Марыля, Гамон, Пракоп, Масей Галёнка, Захар Відэрка, Пятро Ламака, Васіль Каленік, мясцовы блукальнік па зямлі Кузёмка...

Гніламёдаў-празаік ужо на пачатку трэцяга тысячагоддзя імкнецца зразумець нацыянальны склад быцця беларусаў. Хто такія беларусы пад сонцам адзіным для ўсяго свету, беларускі дух — ціхмяны і нязломны адначасова? Беларускі шлях — загадкавы і непарушны? У гэтым плане яго тэксты працягваюць традыцыі мастацкіх дыскурсаў К. Чорнага, І. Мележа, І. Пташнікава, В. Быкава, І. Чыгрынава, У. Караткевіча...

«Хроніка» У. Гніламёдава — гэта твор, які з вялікай сілай выражае ўнутранае памкненне нацыянальнай літаратуры да эпасу, памкненне ўвасобіць свет-універсум у адзінстве яго прыродных і гістарычных сувязяў. У адзінстве Чалавека і свету.

❑ ❑ ❑

Шматграннасць таленту Уладзіміра Гніламёдава праяўляецца ў яго памкненні да мастацкага эксперыменту. Элементамі навізны пазначана яго «Хроніка», дзе сублімуюцца і канвергуюцца розныя стылявыя пласты, апавядальныя жанры, фальклорныя матывы, дакументальнае пісьмо. Не менш цікавым вопытам мастацкай дакументалістыкі з'яўляецца яго раман-дзённік «Сем гадоў у ЦК» (надрукаваны ў «Полымі» ў 2011 г.). З 1969 па 1976 год пісьменнік працаваў у апараце ЦК КПБ. Але і там ён імкнуўся, як і заўсёды, *«заставацца сабой»*.

Раман-дзённік — гэта не толькі храналогія асабістага жыцця аўтара, храналогія літаратурных і іншых падзей адзначанага перыяду. Гэта само жыццё — складанае, супярэчлівае, канфліктнае. Жыццё ў рамантычнай афарбаванасці і драматычнай абвостранасці. Жыццё дынамічнае — у філасофскіх развагах і літаратурных спрэчках. Жыццё для сённяшніх пакаленняў часам не вельмі зразумелае і не зусім пазітыўнае. Але яно было. І пісьменнік адлюстраваў яго менавіта такім, якім яно было. У гэтым яго бясспрэчная заслуга.

Валянціна ЛОКУН.

ПЕСНІ ДУХМЯНАГА СЕНАВАЛУ

СКВЕР ІМЯ УЛАДЗІМІРА ВЫСОЦКАГА З'ЯВІЦЦА Ў НАВАГРУДКУ

Уладзімір Высоцкі — асоба легендарная, любімец публікі. Ён выдатна валодаў увагай залы — зараджаў яе сваёй энергетыкай, на ўсе пытанні адказваў дасціпна і з гумарам. Такім яго памятаюць тыя, хто асабіста слухаў і ведаў яго. У тым ліку — нашы землякі. Пастаянна выступаў і здымаўся ў фільмах Высоцкі і ў Беларусі — яго любілі і на канцэрты імкнуліся трапіць усе, незалежна ад узросту, службовай пасады. Аднак памяць славутага артыста набудзе матэрыяльнае ўвасабленне толькі зараз: у кастрычніку ў Навагрудку адкрыецца сквер імя Уладзіміра Высоцкага, у якім будзе ўсталяваны бронзавы бюст артыста.

З гэтай ініцыятывай выступіў старшыня Навагрудскага райвыканкама Анатоль Маркевіч. Аднак чаму ж менавіта Навагрудак? У 1969 годзе Высоцкі бываў тут са сваёй жонкай Марынай Уладзі падчас здымак фільма Віктара Турава «Сыны ідуць у бой» па сцэнарыі Алеся Адамовіча.

Збіраючыся на здымкі, Высоцкі казаў Тураву пра будучую паездку з Уладзі: «Я хачу паказаць ёй тваю Беларусь». Так і адбылося: закаханая пара дзесяць дзён пражыла ў вёсцы Літоўка, што бліз Навагрудка. Мясцовы жыхар Георгій Бако распавядаў, што Марына Уладзі з'явілася ў вёсцы за руку з артыстам, прычым апранута яна была ў незвычайны на той час ярка-блакітны касцюм са штанамі клёш. Пасля маладая жанчына прыходзіла гатаваць сняданак і вячэру на кухню звычайнай драўлянай хаты. А спалі закаханыя на сенавале; там жа, у паветцы, Высоцкі ствараў свае вершы.

Прыехаў на здымкі паэт без нарыхтовак песень. Яму далі прачытаць сцэнарый, і ён адразу пачаў пісаць. У кіналенце прагучала некалькі песень артыста: «Песня пра зямлю», «Ён не вярнуўся з бою», «Сыны ідуць у бой». Самі Высоцкі і Уладзі ў фільме не здымаліся.

Яны гулялі па цяністых алеях каля возера Літоўка, любаваліся прыгажосцю Свіцязі. Марына Уладзі так распавядае пра гэтую паездку ў сваёй кнізе «Уладзімір, або Перарваны палёт»:

«Тваё выздараўленне працягваецца ў Беларусі. Адзін з сяброў — рэжысёр Віця Тураў, у якога ты здымаўся ў фільме пра партызан, — прывозіць нас у вёску, якая ацалела ў вайне, дзе мы спыняемся ў мілай бабкі. Хата малюсенькая, затое ёсць добры гарод, а каза дае досыць малака, каб шторанічы ты выпіваў яго, яшчэ цёплага, вялікі кубак. Мы праводзім дні ў прагулках па ваколіцах, Віця паказвае нам месцы, дзе чвэрць стагоддзя таму ішлі жорсткія бітвы. А тым часам прырода такая выдатная! Ідэальна круглыя азёры акружаны ўзгоркамі».

«...Мы ідзём спаць на вышкі. Духмянае сена — замест пасцелі. За перагародкай рохкае свіння і пратэстуюць патурбаваныя куры. Усю ноч ты ўслых складаеш вершы. Строфы нараджаюцца адна за адной. Узнікаюць выявы... Як і ў самым пачатку, у школе, калі ў цябе яшчэ не было гітары, ты адбіваеш рытм рукой. У гэтую доўгую ноч нарадзіліся тэмы большасці тваіх песень ваеннага цыклу... «

З Літоўкі Высоцкі і Уладзі адправіліся ў Навагрудак. Там яны спыняліся ў мясцовым гатэлі — у адзіным на той час двухпакаёвым пакоі-люксе з ваннай, што меў нумар 320. Зараз ён пранумераваны як 325-ы і асаблівым попытам не карыстаецца, бо з'явіліся больш камфартабельныя. Аднак быў час, калі фанаты спецыяльна прыязджалі з іншых куткоў Беларусі, каб пабыць у тым жа месцы, дзе адпачываў іх любімы спявак.

Скульптар Генадзь Буралкін працуе над бюстам Уладзіміра Высоцкага.

Гуляла славутая пара і па Замкавай гары... А ў кінатэатры «Зорка» адбылося неафіцыйнае выступленне Высоцкага. Дакументальнага пацвярджэння гэтага не захавалася, аднак навагрудчане памятаюць той канцэрт і часта распавядаюць пра яго.

Сквер, што будзе насіць імя Высоцкага, размяшчаецца ў Навагрудку на рагу вуліц Камсамольскай і Савецкай, побач знаходзіцца кафэ «Маладзёжнае». Зараз у скверы вядзецца добраўпарадкаванне: усталёўваюцца лаўкі, разбіваюцца клумбы, газоны, робяцца дарожкі.

Стварыць бюст артыста замовілі Генадзю Буралкіну. Праца ў скульптара ідзе да завяршэння: хутка будзе зроблена форма, з якой адальюць бронзавы бюст.

Буралкін распавёў пра асабістае стаўленне да гэтага артыста:

— Для мяне Высоцкі — незвычайная асоба, яго песні заўсёды даходзілі да сэрца. Некалі я думаў, што гэта дарослы мужчына, які прайшоў вайну, а аказалася, што гэта малады чалавек, які так пранікнёна выконваў песні. Пэўна, то быў спявак і акцёр ад Бога. Я памятаю, як ён выступаў у Акадэміі мастацтваў у Мінску, дзе я вучыўся. Ён гутарыў са студэнтамі, расказваў пра сваё жыццё, пра свае спектаклі, пра ўласныя погляды — што яму падабаецца, а што не, што б ён хацеў бачыць увогуле, — прыгадвае скульптар.

Генадзь Буралкін лічыць Высоцкага адным з найвыдатнейшых паэтаў і ставіць яго ў адзін шэраг з Яўгенам Еўтушэнкам, Робертам Раждественскім. Таму зрабіць бюст артыста — для яго справа асаблівая. Скульптар прызнаўся, што зробіць яшчэ адну невялікую выяву барда і пакіне сабе на памяць у майстэрні.

— Запісы Высоцкага былі ў дэфіцыце, — прыгадвае Буралкін. — Я памятаю, як на рэнтгенаўскіх здымках былі запісаны яго песні, і іх мы набывалі на «чорным рынку».

Скульптар рабіў некалькі эскізаў бюста паэта. Спачатку гэта былі выявы без гітары, без рук. Аднак Буралкіну хацелася паказаць яго як барда, як паэта, што мае зносіны з залай, — гэта мастак і ўвасобіў у канчатковым варыянце.

Вышыня помніка будзе 2,40 метра, усталююць яго ў Навагрудку ўжо ў кастрычніку. Буралкін мяркуе:

— Я думаю, помнік там прыжывецца, такое добрае выбрана месца. Там моладзь і зараз збіраецца, спявае пад гітару. І помнік у скверы добра праглядаецца з розных бакоў. Кожны чалавек, што будзе праходзіць, паглядзіць, падумае, прыгадае вершы Высоцкага — і гэта таксама выдатна. Бо для горада важныя не толькі будынкі, але і яго духоўная культура.

Старшыня Навагрудскага райвыканкама Анатоль Маркевіч распавёў, што ёсць думка праводзіць у скверы фестываль бардаўскай песні.

Новы сімвал з'явіцца ў Навагрудка, падкрэсліць яго статус надзвычай прывабнага для турыстаў горада. І сімвал цэлай эпохі — любімы народам паэт — таксама атрымае ўвасабленне. У навагрудскім скверы побач з бюстам паэта будуць збірацца не толькі аматары добрай паэзіі і гітарнай музыкі — там будзе нябачна лунаць прывід яскравага кахання Высоцкага і Уладзі, што некалі, можа, наяве хадзілі тут, узяўшыся за руку.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,
фота аўтара.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Жаночая паэзія, жаночая проза... Дзякуючы намаганням крытыкі адчуваецца ў гэтых паняццях нейкая паблажлівасць. Але яшчэ Платон сцвярджаў, што мужчына і жанчына дапаўняюць адно аднаго. Вядома, ён укладаў гэтую думку ў філасофскі кантэкст, аднак яна цалкам справядлівая і ў адносінах да літаратуры. Дарэчы, сёння ў беларускім прыгожым пісьменстве колькасць жанчын-празаікаў значна большая, чым гэта было, калі браць любы перыяд дваццатага стагоддзя, што ўскосна пацвярджае і конкурс апавяданняў «Звязды».
Апошнім часам усё больш упэўнена заяўляе пра сябе сваімі творамі і Ірына Тулупава, якая летась выдала першую кнігу прозы «Шчасце на парозе тваім». А яшчэ Ірына — вопытны журналіст, лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро».

Алесь БАДАК

Ірына ТУЛУПАВА

НАПАМІН ДУШЫ

«ГЭТА ты, мой каханы. Гэта ты. Мой бязлітасны майстар, хто практыкуе па выпраўленні чалавечых характараў і пачуццяў.

Майстар аб'ёмнай разьбы па дрэве ведае: каб задуманая слаўная, прыгожая скульптура атрымалася, варта браць мяккі матэрыял. З дрэва — духмянаквяцістую ліпу. А ты знаходзіш сярод блізкіх і дарагіх людзей найбольш адухаўлёных і падатлівых, тых, хто цябе любіць і не стане ні ў чым пярэчыць. І робіш з іх асоб, якіх хацеў бачыць, каго малюеш у вобразах. Людзі, ідучы табе насустрач, з цікаўнасцю назіраюць, як становяцца іншымі, быццам самі ператвараюцца ў дойлідаўскія статуэткі.

Няўжо я ўсур'ёз разлічвала на каханне? Гэта ў Флабера — «Выхаванне пачуццяў». Хто яго сёння чытае?

Чым жа адрозніваюцца сапраўдныя пачуцці ад прымітыўных падробак пад іх? — Тым, чым копія адрозніваецца ад арыгінала — ілюзорнасцю адлюстраванага ў ёй свету. Копія рэтранслюе ўсяго толькі нечый погляд на навакольны свет. Можна захацець пранікнуць ва ўнутраны свет жанчыны — і надзяліць яе густой палітрай сваіх скажоных поглядаў. Так, што ўбачыцца ў ёй антыідэал. Я хацела зразумець, якою ты бачыш мяне і стаць такою. А ператварылася ў драўляную фігурку на тваёй сядзібе.

Ты выштукаваў з мяне нованага чалавека, іншую жанчыну. Яна ўвайшла ў свет адразу дарослай, мінуючы бесклапотнае дзяцінства — мяне дзяўчынкаю ты не ведаў. Са сваімі лёгкімі забавамі, прыемнымі нечаканасцямі, першымі радасцямі і расчараваннямі я засталася невядомаю табе. І складаны мой пераходны ўзрост застаўся недзе на збочыне маёй новай дарогі. Той, па якой ішлі мы з табой. Ты — парадзе, я, панурыўшы галаву, як школьніца, якая не засвоіла ўрок, за табою. І добра, махнула рукою я, добра што ўсё так атрымалася, і ты, дрывасек, не зачапіў сякеркаю маё бесклапотнае, кволае, як расточак бярозкі, дзяцінства: чалавек, сталеючы, нічога не набывае. Ён пазбаўляецца лішняга, што перашкаджае ўпэўнена, без дакораў сумлення, уваходзіць у рэальны свет. Ты быў першы, хто ўбачыў прыдатны матэрыял для працы, і адсек лішнія галінкі. Ты чамусьці захацеў, каб і я стала драўлянай. Каб не чула нічога навокал, хоць віравала наўкруг маладое жыццё; была сляпой, што горнецца да сумніўнага цяпла, і бяздушнай. Толькі я не змагла такою быць, хоць вельмі старалася дагадзіць табе. І на час недзе згубіла свой духоўны стрыжань. Ты не ламаў яго, і яго пругкасць не стала табе сілаю супраціўлення. І не гнуў, як лазовую галінку, — яна не выгіналася назад, хлістаючы цябе па твары.

...Зноў і зноў перабіраю сваю памяць і не разумею, як так атрымалася, што я прапісалася ў тваім непрытульным краі, як стала той, якой ты мяне бачыў? Як дапусціла такое сваё пераўвасабленне? Мо тады, калі прыняла чорнае як абранае табою? Ты мог любіць жанчыну і думаць пра яе самае горшае. Раўнаваць — не даючы права абараняцца. Сварыцца, дыскутаваць, абвінавачваць яе і зноў мірыцца — і ўсё без яе ўдзелу. Разагрэтая ва ўяўленні рэўнасць — як дзіця, якому дазваляецца ўсё: то яна гарэзлівая, то пачцівая, то прымусіць паверыць у казку, то абавяжа стаць філосафам-утапістам. І ўсё — дзеля галоўнага: самаапраўдання яе існасці. Чалавек пасля разбярэцца, што падмяніліся паняцці. А пакуль выкажа недавер логіцы і будзе прыносіць ненажэрнаму пачуццю рэўнасці ахвяру за ахвярай: ёю штораз будзе каханая. Як жывая істота, якой баліць, яна будзе крычаць і прасіць літасці. Як жрэц, што прыносіць ахвяру, ты будзеш ведаць: тваёй драпежніцы-рэўнасці патрэбна свежая кроў. І прыдумваць новыя выпрабаванні для каханай ахвяры. Чакаць, чакаць калі яна, каханая, не вытрымае: хай будзе па-твойму. І значыць, мець права зазірнуць у вочы сваёй абранніцы і знайсці ў іх доказ першай (альбо чарговай?) нявернасці. А ці першай? — Заказлыча бурная, неўтаймоўная фантазія творцы. Ці можа здрада быць першай, калі запаланіла сабою ўвесь Сусвет? Перадусім — сусвет жаночых душаў?

Вось ён, край, дзе сыходзяцца зямля і неба. Трыумфальны для цябе, захмараны — для каханай.

Душа чалавека можа альбо расквеціцца, альбо згубіцца ў зарасцях спакус. Ты хацеў бачыць жанчыну распутнай — і ўбачыў. Няважна, што яна засталася такою ж, як і была. Словы матэры з ім пра памылкі — і абурыцца яго пакрыўджанае Эга.

Той сабе, пра якую ты мроіў, я напачатку дзівілася. Бянтэжылася ад таго, як непрыгожа, але — аддамо належнае: з непрыхаванай горыччу за тое, што я ў цябе такая душэўна непрывабная,— ты можаш пра мяне думаць. Пасля абуралася. Пратэставала жаночая існасць. Калі ты дазваляеш сабе так пра мяне думаць, то, напэўна, маеш на гэта права, разважала я. Сціскаючы сваю душу да памераў, якія ты ёй адводзіў, трымала свае эмоцыі, як магла. А хацелася біць сціснутымі кулакамі па тваёй грудзіне: адумайся, што ты робіш, на калені пастаўлена найвышэйшае з пачуццяў — Каханне! Ты хацеў пераканаць, што яго ў XXI стагоддзі няма — не выжылі цягам стагоддзяў яго носьбіты. Што чалавецтва выраслася шчырасці і цнатлівасці, што ўсё ў яго пераасэнсавана да аб'яўлення адмоўнага станоўчым і наадварот. Што ўсё ў людзей навыварат.

Нечаканае адкрыццё збянтэжыла: ты — той, хто хоча самога сябе пераканаць, быццам яго любіць немагчыма. Ды не ж! Інакчай ты не даводзіў бы жанчын да крайняй мяжы, калі дарогі назад няма. А ты бярэш іх за руку, лічыш, як доктар, паскораны стук сэрца, калі пульсуюць скроні... вернасці. Гэта таксама мастацтва — умець вытрымаць боль. Я трымала. Аж пакуль не зразумела — мае нязбыўныя летуценні раптам апускаюцца на мае ж плечы. Яшчэ адна ілюзія: быццам гэта той самы крыж, які чалавек нясе добраахвотна. На самой справе ценем ідзе той, хто не дае збочыць.

Групоўка аб'яднаных у сваёй нянавісці да асобы людзей згуртоўваецца на глебе яе непрыманя. І пачынаюць помсціць: дробна, але часта. Гэтыя нападкі не маюць належнай моцы і таму разбурыць асобу не ў стане, але пагана ад іх колькасці, ад незлічоных спроб калі не зламаць, дык сагнуць чалавека. Прымусіць яго заставацца ў той багне, якую бачаць вакол сябе.

Мы ж дамовіліся: ты зрабіў мяне адразу дарослай. То навошта патрабуеш, каб перад тым, як прыняць рашэнне, я аглядалася на цябе? Хочаш кіраваць мною — дык кіруй. Пры чым тут каханне? Я адзервянелая, але ж — не бяздушная. А новую душу ўдыхнуць ты не змог. І я са сваёю буду да скону. Панясу яе, як крыж. Калі з цяжкасцю, калі — легкатою. Сувымяраючы свае ўчынкі з тым, як адгукнецца на іх мой унутраны голас.

Даруй, каханы, гэта не маё. Я вяртаюся да сябе той, рэальнай, а не прыдуманай табою».

Міхась паставіў апошнюю кропку ў пісьме. На клавіятуру камп'ютара з ілба ўпала кропля поту. Ён упершыню паспрабаваў выкласці думкі сваёй каханай на паперу, паставіўшы сябе на яе месца — і атрымалася непрыемная споведзь. «Як жа жанчыны жывуць, так блізка прымаючы ўсё да сэрца?»

Ён набраў свой электронны адрас, у графе «даставіць» надрукаваў дату наступнага дня: перачытваць ліст сёння не хопіць сіл. Заўтра ён перачытае тое, што магла б сказаць яму Таня (сапраўды, трэба даць ёй глытнуць вольнага паветра) — і прымецца шукаць новы аб'ект увагі...

ДЭПАРТАМЕНТ
ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ
Міністэрства фінансаў
Рэспублікі Беларусь
ЗАВЕРАНА
22.08.2012 г.
Сушко С.А.

белагропромбанк
традиции будущего

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» для юридических лиц сто двадцать девятого, сто тридцатого, сто тридцать первого выпусков

1. Наименование эмитента:
а) полное наименование:
на белорусском языке – адкрытае акцыянернае таварыства «Белаграпрамбанк»;
на русском языке – открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее – Банк);
б) сокращенное наименование:
на белорусском языке – ААТ «Белаграпрамбанк»;
на русском языке – ОАО «Белагропромбанк».

2. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)
Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.
Телефон: (017) 229 63 26, факс (017) 229 64 43.
Электронный адрес E-mail: info@belapb.by
УНП 100693551, ОКПО 00040577.

3. Наименование периодического печатного издания, в котором ежегодно будет публиковаться бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках, и сроки их публикации
Бухгалтерский баланс и отчет о прибыли и убытках Банка ежегодно публикуются в газете «Звязда» и «Рэспубліка» не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года.
Бухгалтерский баланс на 1 января 2012 года и отчет о прибыли и убытках за 2011 год опубликованы Банком 24.03.2012 в газете «Звязда» и 24.03.2012 в газете «Рэспубліка».

4. Размер уставного фонда Банка
Уставный фонд Банка составляет 6 603 635 046 000 (Шесть триллионов шестьсот три миллиарда шестьсот тридцать пять миллионов сорок шесть тысяч) белорусских рублей.

5. Депозитарием, обслуживающим Банк, является Депозитарий ценных бумаг Банка (адрес: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3), действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, регистрационный номер 02200/5200-1246-1085, срок действия лицензии до 18.07.2022.

6. Дата, номер государственной регистрации Банка и наименование органа, его зарегистрировавшего
Банк преобразован из Белорусского республиканского банка Агропромбанк СССР учредительной конференцией 11.02.1991 и зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 03.09.1991, регистрационный №20. Устав Банка утвержден общим собранием акционеров 11.02.1991 (протокол №1) (с изменениями и дополнениями, зарегистрированными постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 13.03.2012 №111).
Банк в своей деятельности руководствуется законодательством Республики Беларусь, международными договорами Республики Беларусь, локальными нормативными правовыми актами Банка, а также Уставом Банка.

7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций сто двадцать девятого, сто тридцатого, сто тридцать первого выпусков
7.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение
Решения о выпусках облигаций сто двадцать девятого, сто тридцатого, сто тридцать первого выпусков для юридических лиц в соответствии с Уставом Банка утверждены Наблюдательным советом Банка 06.08.2012, протокол № 24.
7.2. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям
Выпуски облигаций осуществляются без обеспечения по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что общий размер обязательств по таким облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка (подпункт 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг»).
По состоянию на 01.07.2012 нормативный капитал Банка составляет 8 178 715,7 млн. бел. рублей.
7.3. Выпуски облигаций согласованы Национальным банком Республики Беларусь (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 13.08.2012 № 413).
7.4. Цель выпуска облигаций и направления использования средств, от размещения облигаций
Выпуски облигаций осуществляются в целях привлечения денежных средств юридических лиц.
Привлеченные средства от размещения облигаций будут направлены на финансирование реального сектора экономики.
7.5. Форма выпуска и вид облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость облигаций:

№ выпуска	129	130	131
Валюта займа	Белорусский рубль	Белорусский рубль	Российский рубль
Форма выпуска и вид облигаций	Бездокументарные, именные, процентные, неконвертируемые		
Объем эмиссии	200 млрд.	200 млрд.	150 млн.
Количество облигаций (шт.)	200 000	200 000	15 000
Серия, номера облигаций	ОБ129 0000001 - 0200000	ОБ130 0000001 - 0200000	ОР131 0000001 - 0015000
Номинальная стоимость	1 000 000	1 000 000	10 000

7.6. Сведения о проведении открытой продажи облигаций сто двадцать девятого выпуска
7.6.1. Период проведения открытой продажи облигаций
Дата начала периода размещения облигаций – 29.08.2012, дата окончания периода размещения облигаций – 28.07.2013.
7.6.2. Место и время проведения открытой продажи облигаций
Размещение облигаций сто двадцать девятого выпуска осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Размещение (продажа) облигаций Банка производится после согласования Национальным банком Республики Беларусь выпуска облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций, опубликования заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь краткой информации об открытой продаже облигаций сто двадцать девятого выпуска.
Первичное размещение облигаций в течение периода размещения осуществляется на внебиржевом рынке путем открытой продажи в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.
Владельцами облигаций могут быть юридические лица. Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации, обязаны перечислить денежные средства в безналичном порядке на счет Банка, указанный в договоре.
Банк вправе не заключать договора купли-продажи облигаций в период размещения, если условия, определенные решением о выпуске облигаций, становятся для Банка экономически невыгодными. Решение о не заключении договоров купли-продажи облигаций в период размещения принимает уполномоченный орган Банка.
Продажа облигаций осуществляется по текущей стоимости на дату совершения операции и рассчитывается по формуле:

$$С = Нп + Дн,$$

где:
С – текущая стоимость облигации;
Нп – номинальная стоимость облигации;
Дн – накопленный процентный доход.
В день начала открытой продажи облигаций текущая стоимость облигации равна ее номинальной стоимости.
Начиная со второго дня открытой продажи, покупатель также уплачивает сумму накопленного процентного дохода, рассчитываемую по следующей формуле:

$$Дн = \frac{Нп \times Пд1 \times (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}) + Нп \times Пд2 \times (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}) + ... +}{100}$$
$$\frac{Нп \times Пдп \times (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366})}{100}$$

где:
Дн – накопленный процентный доход;
Нп – номинальная стоимость облигации;
Пд1, Пд2, ... Пдп – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, уменьшенная на 1 (Один) процентный пункт, за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной;
Т365 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
7.6.3. Срок и порядок обращения облигаций
Обращение облигаций сто двадцать девятого выпуска осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Срок обращения облигаций – 365 календарных дней с 29.08.2012 по 29.08.2013. День начала размещения облигаций и день погашения облигаций считаются одним днем.
Совершение сделок купли-продажи облигаций при их обращении осуществляется юридическими лицами на внебиржевом рынке с заключением договора купли-продажи и (или) биржевом рынке в соответствии с порядком, установленным ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее – Биржа).
Сделки с облигациями на вторичном рынке прекращаются за два рабочих дня:
- до даты выплаты процентного дохода за каждый период начисления дохода в течение всего срока обращения облигаций;
- до даты погашения облигаций.
7.6.4. Дата погашения облигаций – 29.08.2013.
7.6.5. Порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты, период начисления процентного дохода
Выплата дохода по облигациям производится в виде процентного дохода 1 раз в 3 месяца за истекший период начисления дохода владельцам облигаций, которые указаны в реестре владельцев облигаций на дату, предшествующую двум рабочим дням дате выплаты процентного дохода за соответствующий период начисления дохода, а также владельцам облигаций, которые приобрели облигации в период первичного размещения согласно соответствующим договорам после указанного срока формирования реестра до даты выплаты процентного дохода.
Процентный доход выплачивается путем перечисления в безналичном порядке суммы процентного дохода на счет владельца облигаций в белорусских рублях в дату окончания соответствующего периода начисления процентного дохода:

ПЕРИОД НАЧИСЛЕНИЯ ПРОЦЕНТНОГО ДОХОДА				Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей выплаты процентного дохода
Порядковый номер периода начисления дохода	Начало периода	Конец периода, дата выплаты дохода	Продолжительность периода (дней)	
1	30.08.2012	29.11.2012	92	27.11.2012
2	30.11.2012	28.02.2013	91	26.02.2013
3	01.03.2013	29.05.2013	90	27.05.2013
4	30.05.2013	29.08.2013	92	27.08.2013
ИТОГО:	x	x	365	x

В случае если дата выплаты процентного дохода выпадает на нерабочий день, выплата процентного дохода осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим. Проценты на сумму процентного дохода по облигациям за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются. Под нерабочими днями в настоящей краткой информации понимаются выходные дни, государственные праздники, праздничные дни и другие, являющиеся нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Процентный доход по процентным облигациям за первый период начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой начала размещения облигаций по дату его выплаты включительно. Дата начала размещения облигаций (29.08.2012) и дата выплаты дохода за первый период начисления дохода считаются одним днем.
Процентный доход по процентным облигациям за последующие периоды начисления дохода начисляется с даты, следующей за датой выплаты дохода за предшествующий период начисления дохода по дату выплаты дохода за соответствующий период начисления дохода (дату погашения) включительно.
Начисление процентного дохода осуществляется в течение срока обращения облигаций. Со дня истечения срока обращения облигаций процентный доход не начисляется.
Расчет процентного дохода производится путем его начисления на номинал облигации за период начисления дохода, определенный в соответствии с настоящей краткой информацией, по процентной ставке, равной ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), уменьшенной на 1 (Один) процентный пункт.
Расчет процентного дохода осуществляется по следующей формуле:

$$Дн = \frac{Нп \times Пд1 \times (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}) + Нп \times Пд2 \times (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366}) + ... +}{100}$$
$$\frac{Нп \times Пдп \times (\frac{Т365}{365} + \frac{Т366}{366})}{100}$$

где:
Дп – процентный доход по процентной облигации, выплачиваемый периодически в течение срока их обращения;
Нп – номинальная стоимость облигации;
Пд1, Пд2, ... Пдп – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь, уменьшенная на 1 (Один) процентный пункт, за соответствующую часть периода начисления дохода, в пределах которого ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь была неизменной;
Т365 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 365 дней;
Т366 – количество дней периода начисления дохода, приходящееся на календарный год, состоящий из 366 дней.
Облигации предоставляют владельцу право на получение процентного дохода, а также номинальной стоимости облигаций при их погашении в денежных единицах, в которых выражена их номинальная стоимость.
7.6.6. Условия и порядок досрочного погашения облигаций
Наблюдательный совет Банка вправе принять решение о досрочном погашении облигаций сто двадцать девятого выпуска либо его части до даты окончания срока обращения:
- неразмещенных в полном объеме эмиссии на момент принятия соответствующего решения;
- неразмещенных не в полном объеме эмиссии (оставшейся части неразмещенных облигаций) на момент принятия соответствующего решения;
- приобретенных Банком в полном объеме эмиссии до даты окончания срока обращения, в порядке указанном в пункте 7.6.9 настоящей краткой информации;
- приобретенных Банком не в полном объеме эмиссии до даты окончания срока обращения, в порядке указанном в пункте 7.6.9 настоящей краткой информации.
7.6.7. Порядок погашения облигаций
Погашение облигаций производится 29.08.2013 на основании реестра владельцев облигаций. В случае если дата погашения выпадает на нерабочий день погашение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим днем. Проценты на сумму погашения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
При погашении облигаций владельцу выплачивается в безналичном порядке номинальная стоимость облигаций, а также процентный доход за последний период начисления.
При погашении владельцы облигаций обязаны перевести погашаемые облигации на счет «депо» Банка № 100004, раздел 00, счет «депо» ЛОРО №1000009, раздел 00 в срок не ранее даты, на которую формируется реестр владельцев облигаций для целей погашения, и не позднее рабочего дня, следующего за днем перечисления на счет владельца облигаций (выплаты владельцу облигаций) денежных средств, необходимых для погашения. Для осуществления перевода облигаций на счет «депо» Банка в депозитарий владелец облигаций обязан представить поручение «депо», в котором в реквизите «Назначение и (или) основание» указывается: «Перевод ценных бумаг на счет «депо» эмитента в связи с их погашением».
7.6.8. Дата формирования реестра владельцев облигаций для целей погашения облигаций
Реестр владельцев облигаций составляется на дату, предшествующую двум рабочим дням дате погашения облигаций, указанной в пункте 7.6.4 настоящей краткой информации (по состоянию на 27.08.2013).
7.6.9. Условия и порядок приобретения облигаций Банком до даты начала их погашения
В период обращения облигаций Банк может осуществлять приобретение облигаций до даты начала их погашения у любого их владельца 29.11.2012, 28.02.2013, 29.05.2013 по текущей стоимости, равной номинальной стоимости, а также в иные сроки на условиях, утвержденных уполномоченным органом Банка. В случае если дата приобретения облигаций выпадает на нерабочий день, приобретение осуществляется в первый рабочий день, следующий за нерабочим. Проценты на сумму приобретения за указанные нерабочие дни не начисляются и не выплачиваются.
Приобретение облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке в объеме и в порядке, определенные соответствующим договором купли-продажи, заключенным между владельцем облигаций и Банком, и (или) биржевом рынке в соответствии с регламентом Биржи.
Для продажи облигаций Банку владелец облигаций должен:
- не позднее четырех рабочих дней до предполагаемой даты продажи предоставить в Банк заявление о намерении осуществить такую продажу, которое должно содержать:
наименование владельца облигаций;
наименование ценной бумаги;
количество облигаций, предложенных для продажи;
банковские реквизиты счета для перечисления денежных средств за проданные облигации (в случае если приобретение облигаций осуществляется Банком на внебиржевом рынке);
согласие с условиями приобретения облигаций Банком, которые изложены в настоящей краткой информации;
юридический адрес (место нахождения) и контактные телефоны владельца;
подпись уполномоченного лица и печать владельца – юридического лица.
- на внебиржевом рынке:
обеспечить в порядке и сроки, определенные соответствующим договором купли-продажи, перевод указанных в заявлении облигаций со счета «депо» владельца – юридического лица на счет «депо» Банка;
при необходимости предоставить в Банк карточку с образцами подписей, заверенную в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
- на биржевом рынке:
не позднее дня продажи перевести в соответствии с законодательством Республики Беларусь указанные в заявлении облигации на соответствующий раздел своего счета «депо» для участия в торгах на Бирже.
В случае несоблюдения владельцем облигаций сроков предоставления заявления о продаже и (или) перевода указанных в заявлении облигаций – приобретение облигаций Банком не осуществляется.
Банк имеет право осуществлять на вторичном рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь:
- дальнейшую реализацию приобретенных облигаций Банка;
- иные действия с приобретенными облигациями Банка.
7.6.10 Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрещении выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
В случае запрета выпуска облигаций Банк в месячный срок с момента принятия такого решения Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь возвращает владельцу облигаций денежные средства, полученные в счет оплаты облигаций с уплатой процентов за пользование денежными средствами по ставке процентного дохода, равной ставке рефинансирования Национального банка Республики Беларусь (с учетом ее изменения), уменьшенной на 1 (Один) процентный пункт за текущий период начисления дохода, в котором принято решение о запрете выпуска облигаций.
7.7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций сто тридцатого выпуска
7.7.1. Период проведения открытой продажи облигаций
Дата начала периода размещения облигаций – 29.08.2012, дата окончания периода размещения облигаций – 28.01.2014.
7.7.2. Место и время проведения открытой продажи облигаций
Размещение облигаций сто тридцатого выпуска осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
Размещение (продажа) облигаций Банка производится после согласования Национальным банком Республики Беларусь выпуска облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпуска облигаций, опубликования заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь краткой информации об открытой продаже облигаций сто тридцатого выпуска.
Первичное размещение облигаций в течение периода размещения осуществляется на внебиржевом рынке путем открытой продажи в филиалах, отделениях, а также ОПЕРУ центрального аппарата Банка в течение их рабочего времени.
Владельцами облигаций могут быть юридические лица. Юридические лица, изъявившие желание приобрести облигации, обязаны перечислить денежные средства в безналичном порядке на счет Банка, указанный в договоре.
Банк вправе не заключать договора купли-продажи облигаций в период размещения, если условия, определенные решением о выпуске облигаций, становятся для Банка экономически невыгодными. Решение о не заключении договоров купли-продажи облигаций в период размещения принимает уполномоченный орган Банка.
Продажа облигаций осуществляется по текущей стоимости на дату совершения операции и рассчитывается по формуле:

$$С = Нп + Дн,$$

где:
С – текущая стоимость облигации;
Нп – номинальная стоимость облигации;
Дн – накопленный процентный доход.
В день начала открытой продажи облигаций текущая стоимость облигации равна ее номинальной стоимости.
Недвижимое имущество: капитальное строение (инв. № 640/С-31612) – одноэтажное **здание склада № 25/36** общей площадью 684,4 кв.м, 1961 года постройки, фундамент железобетонный, стены – железобетонный каркас с бетонными панелями, кирпичные, перегородки кирпичные, железобетонные, чердачное перекрытие железобетонное, крыша совмещенная, рулонная. Объект расположен на земельном участке площадью 0,9242 га по адресу: Минская обл., Слуцкий район, Покрашевский с/с, 6, военный городок № 25 «Павловка», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания арочного хранилища № 25/36. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 20 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение назначения недвижимого имущества и использование земельного участка для размещения объектов производственно-складского назначения.

Начальная цена предмета аукциона: 288 383 499 рублей. **Размер задатка: 50 000 000** рублей.

Лот № 3

Недвижимое имущество: капитальное строение (инв. № 640/С-31615) – одноэтажное **здание склада № 25/43** общей площадью 684,4 кв.м, 1961 года постройки, фундамент железобетонный, стены – железобетонный каркас с бетонными панелями, кирпичные, перегородки кирпичные, железобетонные, чердачное перекрытие железобетонное, крыша совмещенная, рулонная. Объект расположен на земельном участке площадью 1,0319 га по адресу: Минская обл., Слуцкий район, Покрашевский с/с, 5, военный городок № 25 «Павловка», назначение: земельный участок для содержания и обслуживания арочного хранилища № 25/43. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 20 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение назначения недвижимого имущества и использование земельного участка для размещения объектов производственно-складского назначения.

Начальная цена предмета аукциона: 170 179 797 рублей. **Размер задатка: 30 000 000** рублей.

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона **(по Лотам №№ 1-3)** необходимо: в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды земельного участка осуществить государственную регистрацию права на земельный участок; в случае изменения назначения недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработать строительный проект на реконструкцию объекта в срок, не превышающий двух лет и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; содержать предоставленный земельный участок и прилегающие к нему земли в надлежащем санитарном состоянии.

Продавец (Лоты №№ 1-3): государственное учреждение «Бобруйское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (г. Бобруйск, ул. Парковая, 68, тел. (80225) 481011, 481040, 483636). **Арендодатель земельных участков (Лоты № 1-3):** Слуцкий районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Слуцк, ул. Ленинская, 189, тел. (801795) 22982).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ
по продаже недвижимого имущества, находящегося в республиканской собственности

Задаток для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 24 сентября 2012 г.** включительно. **Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **24 сентября 2012 г. до 12:00.**

Задаток для участия в аукционах перечисляется на текущий (расчетный) счет № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». **Назначение платежа:** ***задаток для участия в аукционе.***

Участник аукциона, желающий принять участие в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задаток по каждому лоту.

Заявления на участие в аукционах с прилагаемыми к ним документами принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 310, 312.**

Информация о предметах аукционов дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество».

Аукционы проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, с учетом норм Декрета Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6 «О стимулировании предпринимательской деятельности на территории средних, малых городских поселений, сельской местности» и Указа Президента Республики Беларусь от 4 июля 2012 г. № 294 «О порядке распоряжения государственным имуществом».

Земельные участки предоставляются победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) в аренду без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договора аренды.

Для участия в аукционе в указанные в извещении сроки необходимо подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы: оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан:

1. подписать протокол о результатах аукциона; 2. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка; 3. после совершения названных действий и представления организатору аукциона, продавцу, и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Возможность предоставления рассрочки оплаты решениями о продаже недвижимого имущества не предусмотрена.

г. ВИТЕБСК **28.09.2012**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
		СО СНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НА 80%		
1.	Здание гаража и мастерской, расположенные по адресу: Витебская область, Оршанский р-н, Высокский с/с, 5.	Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 240/С-18920, одноэтажное каменное здание вспомогательных служб (гараж и мастерская), фундамент железобетонный, крыша совмещенная, общая площадь 675,0 кв.м. Назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), гараж. Земельный участок с кадастровым номером 223681100001000011, площадь 0,2351 га для обслуживания здания гаража и мастерской, сроком аренды 35 лет. Ограничения в использовании в связи с его расположением в охранных зонах линии связи и радиофикации и линии электропередачи напряжением до 1000 В, охранной зоне канализационного коллектора.	26 595 941	**5 319 180**
2.	Здание почтового отделения, расположенного по адресу: Витебская область, Сенненский район, Белицкий с/с, д. Нерейша, д. 2.	Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 242/С-5513 (здание специализированное связи) – одноэтажное сборно-щитовое здание, фундамент бетонный, крыша шиферная, перекрытия деревянные, утепленные, общая площадь 40,7 кв.м. Земельный участок с кадастровым номером 224480807601000002, площадью 0,0213 га для содержания и обслуживания почтового отделения, сроком аренды 35 лет.	3 758 979	**751 790**
3.	Отделение связи, расположенное по адресу: Витебская область, Россонский район, Клястицкий с/с, д. Клястицы, ул. Школьная, д. 8.	Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 253/С-493431(здание специализированное связи), одноэтажное кирпичное, оштукатуренное, фундамент бутовый, крыша асбестоцементные волнистые листы, перекрытия деревянные, общая площадь 142,4 кв.м, с бетонным крыльцом. Земельный участок с кадастровым номером 224282004601000399, площадь 0,0364 га для обслуживания отделения связи, сроком аренды 25 лет.	10 846 014	**2 169 200**
		СО СНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ НА 20%		
4.	Неиспользуемое здание отделения связи, расположенное по ад

■ Рэха публікацыі

«ДА КЛІЕНТА — З КІПЯЦІЛЬНІКАМ І ВЯДРОМ?»

АРТЫКУЛ пад такім загалоўкам пра тое, якім не павінна быць бытавое абслугоўванне вяскоўцаў (па матэрыялах Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці) быў надрукаваны ў «Звяздзе» 7 ліпеня. На публікацыю адрэагавала Міністэрства гандлю Беларусі ў асобе намесніка міністра Ірыны НАРКЕВІЧ:

— У межах рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады ў мэтах дасягнення зацверджаных нарматываў дзяржаўных сацыяльных стандартаў у галіне бытавога абслугоўвання ў сельскай мясцовасці былі адкрыты 553 новыя комплексныя прыёмныя пункты, у тым ліку 444 — у аграгарадках. За кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, а таксама інавацыйнага фонду Міністэрства гандлю яны ўкамплектоўваліся абсталяваннем, неабходным для аказання ўсяго спектра бытавых паслуг, якія прадугледжаны дзяржаўным сацыяльным стандартам. У іх ліку — паслугі цырульняў, рамонт швейных вырабаў, выраб рытуальных прылад, рамонт абутку, мэблі, бытавых машын і прыбораў, тэле- і радыёапаратуры, паслугі пракату, фотапаслугі, прыём заказаў у пральню і хімчыстку.

Пры гэтым у адпаведнасці з Інструкцыяй аб арганізацыі работы сельскага комплекснага прыёмнага пункта, тры першыя віды бытавых паслуг з вышэйназванага пераліку ў абавязковым парадку павінны прадастаўляцца непасрэдна ў КПП.

Разам з тым, істотныя страты ад дзейнасці па аказанні бытавых паслуг у сельскай мясцовасці вымушаюць кіраўнікоў арганізацый **у мэтах мінімізацыі затрат** у асобных выпадках у парушэнне інструкцыі змяняць парадак прадастаўлення паслуг цырульняў і майстэрняў па рамонце швейных вырабаў — аказваць іх па графіку, які адрозніваецца ад рэжыму працы КПП. Так адбылося ў КПП у вёсках Алекшыцы і Кватары Бераставіцкага раёна, Індура Гродзенскага раёна і Галубы Мастоўскага раёна, дзе паслугі цырульняў аказваліся па асобным графіку.

Неабходна адзначыць, што ва ўмовах зніжэння попыту на бытавыя паслугі па прычыне няўхільнага скарачэння колькасці сельскага насельніцтва, якое пражывае ў зонах абслугоўвання КПП, такія дзеянні кіраўнікоў прадпрыемстваў ажыццяўляюцца не ва ўрон якасці абслугоўвання сялян.

ДАВЕДКА:

У 2011 годзе ў параўнанні з 2004 годам у цэлым па рэспубліцы сяроднегадавая колькасць сельскага насельніцтва скарацілася на 16% (539,4 тыс. чал.) і склала 2324,5 тыс. чал. У Гродзенскай вобласці — на 21% (83,6 тыс. чал.) і склала 310,6 тыс. чал.

Улічваючы істотныя дэмаграфічныя і іншыя змяненні, асобныя нарматыўна-прававыя акты, у тым ліку Інструкцыя аб арганізацыі работы сельскага комплекснага прыёмнага пункта, будуць перагледжаны.

Сёння бытавое абслугоўванне сельскага насельніцтва рэспублікі забяспечваецца праз сетку з 1685 КПП. На тэрыторыі Гродзенскай вобласці працуе 247 КПП, у тым ліку 221 — у аграгарадках.У выніку аптымізацыі сеткі сельскіх КПП сёлета ў першым паўгоддзі ў цэлым па рэспубліцы іх колькасць зменшылася на 71, у тым ліку на 10 — на тэрыторыі Гродзеншчыны.

Што тычыцца парушэння графікаў выязнога абслугоўвання жыхароў асобных вёсак і пасёлкаў, то асноўная прычына — нездавальняючы тэхнічны стан аўтатранспарту, які практычна выпрацаваў свой рэсурс. Абнаўленне парку аўтамабіляў арганізацый бытавога абслугоўвання ажыццяўляецца ў межах рэалізацыі мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы ўстойлівага развіцця вёскі на 2011—2015 гады. Летась набылі 13 адзінак аўтатранспарту для выязнога абслугоўвання, сёлета ў першым паўгоддзі — 49. У жніўні-верасні будзе набыта 13 аўтамабіляў для арганізацыі выязнога абслугоўвання насельніцтва Гродзенскай вобласці, у тым ліку адзін з іх — для аказання паслуг жыхарам Мастоўскага раёна.

Намеснік міністра гандлю Ірына Наркевіч таксама паведаміла рэдакцыі аб прынятых мерах па арганізацыі абслугоўвання вяскоўцаў канкрэтных населеных пунктах, якія называліся ў артыкуле. Цырульніцкае абсталяванне, якое не выкарыстоўвалася, кіраўніцтва Бераставіцкага раённага камбіната бытавога абслугоўвання задзейнічае пры стварэнні трох рабочых месцаў цырульніка ў Доме быту, а таксама ў спецыяльна прыстасаваных памяшканнях у будынку крамы і лазні ў райцэнтры. З захаваннем усіх санітарных нормаў і правілаў адноўлена аказанне цырульніцкіх паслуг у КПП вёсак Індура і Кватары. А работы па стварэнні мясцовай каналізацыі ў КПП вёскі Алекшыцы завершацца сёлета да кастрычніка.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ Турыстычныя дарогі

Напрыканцы лета, цёплымі выхаднымі днямі, людзі імкнуцца выехаць за межы душных гарадоў і наведаць цікавыя мясціны. Блакітную крыніцу (альбо Сіні калодзеж) у Слаўгарадскім раёне нездарма называюць адным з цудаў Беларусі. Ваду незвычайнага бірузовага колеру ў невялікай сажалцы народ лічыць гаючай.

ЗЯЛЁНЫ СОЖ І БЛАКІТНАЯ КРЫНІЦА

Блакітная крыніца стала папулярным турыстычным месцам. Яна знаходзіцца літаральна за некалькі кіламетраў ад раённага цэнтра — трэба толькі пераехаць па пантонным мосце цераз раку Сож. У выхадныя дні тут шмат людзей. Яны спяшаюцца пабачыць дзіва прыроды і імкнуцца выканаць старадаўні абрад — акунуцца ў ваду альбо тройчы перайсці ручай, каб здабыць шчасце і здароўе. Гэта, дарэчы, не вельмі проста: вада тут мае пастаянную (улетку і ўзімку) тэмпературу — усяго 6-8 градусаў цяпла.

Побач з крыніцай — альтанкі і мангалы, якія дазваляюць сумясціць прыемнае з карысным. Палюбавацца мясцінамі, смачна паесці, добра адпачыць... Праўда, турыстаў, сярод якіх, дарэчы, шмат расіян, папярэджваюць не ставіцца да крыніцы і яе наваколля як да звычайнага пляжа. Гэта ўсё ж такі сакральнае месца, дзе ўсталяваны крыж і ёсць праваслаўная капліца.

Наведвальнікаў таксама папярэджваюць не браць з крыніцы гліну. Пасля пагалосак пра яе гаючыя ўласцівасці, здабыванне белай гліны набыло такія маштабы, што стала пагражаць існаванню крыніцы. Прыкра бачыць у бірузовай вадзе і дробныя беларускія купюры: напэўна, здароўе і шчасце нельга купіць за грошы, а ахвяраванні такога кшталту толькі засмечваюць помнік прыроды.

Акрамя Блакітнай крыніцы, турысты за адным разам заязджаюць у аграгарадок Лясная, цэнтрам якой з'яўляецца вядомы Свята-Петра-Паўлаўскі храм, узведзены тут у гонар перамогі войскаў Пятра I над шведамі ў час Паўночнай вайны. Бітва адбылася ў 1708 годзе, таму ў 2008-м у Лясной адзначалі яе 300-гадовы юбілей. А царква — невялікая, вельмі прыгожая, з мазаічнымі абразамі на фасадзе і ўтульная знутры — пакідае вельмі прыемнае ўражанне.

У самім Слаўгарадзе можна наведаць яшчэ адну царкву — Раства Багародзіцы і палюбавацца старадаўнімі фрэскамі. У гарадскім парку абняць «дуб кахання» (насамрэч, гэта вялізная ліпа), які паводле падання пасадзіла імператрыца Кацярына. А потым з высокага берага ўбачыць зялёную пойму Сожа і захапіцца яе веліччу. Вось вам і турыстычная праграма на бліжэйшыя выхадныя дні, ці не так?

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.

Слаўгарадскі раён

НАСТРОЙ У ПУЗЫРЫСТЫМ ПОЛІЭТЫЛЕНЕ

Ўкрамах Мінска з'явіліся незвычайныя сувеніры — паветрана-пузырысты поліэтылен. Тавар вырабляе мінскі прадпрымальнік сумесна з дзяржаўнай установай «Спецыяльны дом для ветэранаў, састарэлых і інвалідаў №1» у межах сацыяльнага праекта «POZITIV». Галоўная ідэя апошняга — паказаць, што людзі з абмежаванымі магчымасцямі могуць на роўных быць запатрабаванымі ў грамадстве і працаўладкаванымі.

Разрэзаную на невялічкія кавалачкі і сімпатычна ўпакаваную поліэтыленавую плёнку па сімвалічнай цане ўжо пачалі прадаваць у крамах. Часткова грошы, выручаныя ад продажу такіх сувеніраў, будуць накіраваны на дабрачынную дапамогу. Удзел у вытворчасці пузырыстай плёнкі прымаюць жыхары Спецыяльнага дома для ветэранаў, састарэлых і інвалідаў, што дазваляе ім не толькі рэалізаваць сябе, але і атрымаць за гэта грошы.

Сёння «поліэтылен з пазітывам» можна набыць у ЦУМе, ГУМе, гандлёвым доме «Кірмаш». У хуткім часе поліэтыленавую пузырыстую плёнку можна будзе ўбачыць і на прылаўках іншых крам і, магчыма, нават у кіёсках «Белсаюздрука».

— Самае складанае для нас зараз, — гэта праца з таваразнаўцамі, — расказвае аўтар ідэі прадпрымальнік Алег, які сціпла не пажадаў, каб яго прозвішча згадвалі. — Даводзіцца працаваць з кожным асабіста і тлумачыць нюансы. А гэта адбірае шмат часу.

Новыя сувеніры, перш за ўсё, знойдуць свайго пакупніка сярод дзяцей, падлеткаў, студэнтаў і офісных працаўнікоў. Лопанне пузырыстай плёнкі лічыцца рэлаксатарам і антыстрэсам. Кожны пакупнік атрымае магчымасць заспакоіцца і падняць сабе настрой, але пры гэтым яшчэ і зробіць свой уклад у дапамогу людзям, якім яна патрэбная.

Таксама прадпрымальнік зазначае, што калі вытворчасць будзе мець поспех, то ёсць шмат ідэй для развіцця гэтага праекта, пачынаючы ад расшырэння асартыменту прадукцыі да геаграфічнага ахопу тых, каму можна будзе дапамагчы такой дзейнасцю.

Алена ДРАПКО.

БЕЛЫЯ НОЧЫ НА СВАЕ ВОЧЫ

ЁСЦЬ на беразе Нявы маленькі каменны дамок. Гэта «скрыня», якая захоўвае ад разбурэння адзінае драўлянае збудаванне XVIII стагоддзя, што захавалася ў Санкт-Пецярбургу, — дом, дзе ледзь не дзесяць гадоў жыў Пётр I. Ён жыў там і кіраваў будаўніцтвам горада. Адтуль, з вокнаў дома, першаму расійскаму імператару добра было відаць, як з'яўляюцца першыя сцены — бастыёны Санкт-Пецярбургскай крэпасці (больш вядомай як Петрапаўлаўская). Ішоў 1703 год. А праз пятнаццаць гадоў у гэтых сценах быў закатаваны сын Пятра царэвіч Аляксей...

Фінскі заліў, палацы і фантаны

Прыгажосць вельмі складана апісваць словамі. Яе лепш адчуваць самому. Як можна дакладна апісаць ззянне золата палацаў, вясёлку ў фантанах, выратавальны



«Медны коннік» (каля 23 гадзін).



Палацавая плошча (а палове другой гадзіны ночы).

цень некалькіх гектараў парку? Тым больш складана перадаць шум і пах Балтыйскага мора. Але паспрабуйце ўсё гэта ўявіць. І тады вы зразумееце, як выглядае Пецяргоф — рэзідэнцыя расійскіх імператараў. Думаю, як і я, шмат хто там бываў, калі вучыўся ў школе. Аднак (я ўпэўнены!) у сталым узросце Санкт-Пецярбург і яго наваколлі ўспрымаюцца зусім па-іншаму. Прыходзіць разуменне таго, сярод якой раскошы ты знаходзішся. А пасля ўзнікаюць адпаведныя пытанні: хто, як і для чаго гэта зрабіў?

Фактычна рэалізавана гэта было дзякуючы намаганням Пятра I. Ён амаль усё сам праектаваў і назіраў за выкананнем. Прычым усё рабіў сам, а не так, як бывае: узводзілі людзі, а помняць манарха, які ў той час жыў (і добра, што хоць дазвол на тое даў). Будучы імператар быў іншым: вельмі кемлівы і разумны, ён хуценька вучыўся ўсяму, што яму было неабходна — будаванню караблёў, архітэктуры і гэтак далей. Таму гэты чалавек быў спецыялістам у розных сферах, што дазваляла яму рабіць усё якасна. Вось і ў шыкоўным Пецяргофе кожны фантан будаваўся па яго асабістым дакладным апісанні. Калі ён толькі ўсё паспяваў? Нагадаю, што ў гэты час яшчэ ішла Паўночная вайна са Швецыяй. Але і «рускі Версаль» пабудаваў, і вайну выйграў...

Уначы светла, як пры заходзе сонца

І свой горад пабудаваў таксама. Цяпер яго добра глядаць летам падчас белых начэй. Калі ўвогуле гэта можна назваць такім словам — «ноч». Гэта нейкія занадта пахмурныя дні, не больш за тое. Увесь час складваецца ўражанне, што сонца заходзіць, заходзіць — і раптам вісне ў небе. Як быццам гэтая зорка чапляецца за штосьці. І атрымліваецца, што апоўначы так светла, як увечары, калі сонца пачынае садзіцца. Затое які прыгожы горад у такіх мяккіх і ласкавых промнях святла! Усё навокал становіцца то ружаватым, то блакітным... Дзе-нідзе прарываюцца апошнія чырвоныя струменьчыкі з-за гарызонту. Усё гэта дзякуючы Пятру. Вунь ён глядзіць на Няву з высокай скалы — гэта помнік Пятру I (знакаміты «Медны коннік»). Ён аглядае свае ўладанні, а дакладней — сваё стварэнне. І, напэўна, сам здзіўляецца, як паспеў столькі за жыццё? А мне здаецца, што нейкага страшнага сакрэту тут няма. Проста гэта быў апантаны чалавек. Ведаеце, напэўна, так бывае, што нейкая справа займае ўсе вашы думкі, вы забываецеся на ежу, піццё, адпачынак. Вы разумееце, што калі вы гэтага не зробіце, то не зможаце спакойна жыць. Мне, напрыклад, такое пачуццё знаёмае. Відаць, у такіх людзей, як Пётр I, гэтая апантанасць — вызначальная. Іначай як можна растлумачыць, што чалавек, які стварае такую прыгажосць, закатаваў свайго сына, што быццам выступаў супраць бацькі, падбухтораны нязгоднымі баярамі, а насамрэч ён проста не хацеў перайматься царства. Кажуць, што самадзержац быў вельмі неўраўнаважанага нораву. А супакоіць яго магла толькі каханая жонка. У той дзень, калі Пётр прыйшоў да сына, жонкі побач не аказалася... Вось так — адзін і той жа чалавек стварае цэлы горад як твор мастацтва і забівае блізкіх...

Фантан «Самсон» у Пецяргофе.

Заходзіш — і дух займае, як на вышыні

У Кранштаце, горадзе марской славы, які знаходзіцца на востраве Фінскага заліва Котлін, ёсць найвыбітнейшы архітэктурны твор. Купал Марскога сабора святіцеля Мікалая Цудатворцы добра відаць з мора, як маяк. Пабудавалі сабор у 1913 годзе (а пачалі будоўлю яшчэ ў 1902-м). Затое за 11 гадоў быў узведзены найпрыгажэйшы сабор, які мне ў мае 22 гады даводзілася бачыць. Для таго, каб вы зразумелі велічэ гэтага збудавання, дам параўнанне: вышыня сабора разам з крыжом — 70,5 метра, а вышыня Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — 73,6 метра. Аднак нават такая вышыня ўражвае не столькі, колькі ўнутранае аздабленне храма. Пакуль што там працягваецца рэстаўрацыя, а цэнтральны ўваход зачынены. Даводзіцца заходзіць з левага боку. Спачатку ты нічога асаблівага не бачыш, а праз некалькі крокаў збочваеш направа — і над табой вялізны купал, размаляваны прыгожымі фрэскамі. У гэты момант дух займае, як калі апынешся на ўскрайку высокага абрыву. Зноў-такі цяжка гэта ўсё перадаць словамі. Лепш пабачыць самому. Будзеце там — не палянуйцеся зайсці.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ, фота аўтара.

г. Санкт-Пецярбург — г. Пецяргоф — г. Кранштат.

«Дом стары, у садзе пустым, як шар зямны без людзей...» Гэтыя радкі з песні Уладзіміра Асмолава вельмі трапна апісваюць закінутыя пабудовы. Для адных людзей такія будынкі — культавае месца. Іх вабіць туды адчуванне забытасці, адчужэння, прысутнасці нейкай таямніцы. Для кагосьці — гэта сімвал маленства. Іншыя ставяцца да закінутых дамоў насцярожана. Чым буйнейшы населены пункт, тым вышэйшая верагоднасць таго, што ў нежылой пабудове з'явяцца няпрошаныя госці рознага кшталту — ад бадзяжных сабак да людзей без пэўнага месца жыхарства. Што, безумоўна, не дадае радасці жыхарам навакольных дамоў. Парослыя цвіллю сцены, праёмы вокнаў забіты дошкамі альбо ззяюць прагаламі, горы смецця... Гэтыя будынкі можна сустрэць не толькі ў вёсках, але і ў цэнтры сталіцы.

РУІНЫ ГЛЯДЗЯЦЬ ВА ЎПОР

«Раней тут жылі людзі»

Як ні дзіўна, але, аказваецца, ёсць у Мінску мікрараён, дзе даўно апусцелыя пабудовы — далёка не рэдкасць. Гэта пасёлак трактарабудаўнікоў. Большасць дамоў у ім была ўзведзена ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. У пасёлку выразна адчуваецца атмасфера той эпохі — раскідзістыя дрэвы паабапал вузкіх вуліц, па якіх рэдка праедзе аўтамабіль, дамы сталінскай пабудовы, адпаведныя таму часу назвы — Стаханаўская, Кашавога. Канчаткова не застацца ў далёкім мінулым перашкаджае хіба што блізкасць да станцыі метро.

Увагу прыцягнуў яўна закінуты двухпавярховы будынак насупраць аўтобуснага прыпынку на вуліцы Чабатарова. Праёмы, дзе калісьці былі вокны і дзверы, забіты дошкамі альбо закладзены цэглай. Ад страхі засталіся адны кроквы... Сцены, якія даўно не ведалі тынкоўкі, — зрэшты, тут гэтым нікога не здзівіш: плямы ззяюць і на жылых дамах.

— Скажыце, калі ласка, а што тут было раней? — пытаюся ў пажылой жанчыны, якая выйшла з суседняга дома.

— Дзіцячы садок. Ды вось толькі ўжо прайшло гадоў з пятнаццаць, як ён закрыўся. Раён наш стары, дзяцей стала значна менш. Шчыра кажучы, маладых

маці з вазкамі я бачу нячаста. Каб жа гэта быў адзіны закрыты садок. Прайдзіце ў бок трамвайнай лініі — літаральна праз пяць хвілін пабачыце яшчэ адзін...

— Гледзячы на страху, адразу ўспамінаю руіны з ваенных фільмаў...

— О, вы памыляецеся, — смяецца жанчына. — Завітайце на Вучнёўскі завулак, вось там знойдзеце сапраўдныя руіны.

Узброіўшыся планам Мінска, кіруюся праз навакольныя кварталы да Вучнёўскага завулка. Справа застаецца яшчэ адзін закінуты дзіцячы садок з усімі адпаведнымі «атрыбутамі». Парадавала толькі тое, што тэрыторыя вакол гэтых дзвюх пабудоў рэгулярна прыбіраецца — каб знайсці пустую пластыкавую бутэльку альбо цыгарэтны пачак, трэба вельмі добра пастарацца.

Некалькі хвілін — і шыльда на будынку сігналізуе аб тым, што трэба паварочваць у завулак. А там стаіць дом, які... Зрэшты, назваць домам убачанае відовішча можна з вялікай нацяжкай.

— Раней тут жылі людзі. Была звычайная двухпавярхоўка, як і дамы побач... Але гадоў з дзесяць таму адбыўся вялікі пажар. Людзей адсялілі, а разваліны так і засталіся стаяць.

Першая думка, якая мільганула: «Пэўна, у гэтую пабудову падчас вайны трапіла нямецкая авіябомба, і ўсё захавалася да нашых дзён у нязменным выглядзе». Фактычна ад будынка засталіся толькі сцены. Адно акно на другім паверсе вышчарблена так, што зверху ад праёма ацалелі тры-пяць цаглін. Слыхавое акно, якое калісьці было на гарышчы, а зараз — круглая адтуліна, праз якую з вуліцы відаць неба, — быццам вока, што назірае за наваколлем... І ўся гэтая «прыгажосць» абнесена глухім плотам у рост чалавека. Карта паведамляе, што адрас гэтай пабудовы — Вучнёўскі завулак, 7. Бо шыльды тут няма.

Мясцовая жыхарка Ганна гаворыць:

— Раней тут жылі людзі. Была звычайная двухпавярхоўка, як і дамы побач... Але гадоў з дзесяць таму адбыўся вялікі пажар. Людзей адсялілі, а разваліны так і засталіся стаяць.

Усе тры будынкі знаходзяцца на балансе жыллёва-камунальнага аддзела Мінскага трактарнага завода. **Начальнік вытворча-тэхнічнага бюро Павел ТАГУШОЎ** гаворыць, што закінутым пабудовам засталося стаяць нядоўга:

— Цяпер распрацоўваецца праектная дакументацыя на знос дзіцячых садкоў па адрасах Чабатарова 7а і 16а, а таксама пабудовы №7 у Вучнёўскім завулку. Таксама ўзгадняецца пытанне з райвыканкамам Партызанскага раёна для атрымання дазволу на знос. Ідзе пошук інвестара, які згадзіўся б пабудаваць новыя дамы. Аднак трэба ўлічваць адно «але». Каб не сапсаваць існуючы архітэктурны ансамбль і не парушыць нормы па інсаляцыі (асвятленню сонечнымі промнямі) у старых жылых памяшканнях, вырашана, што новыя будынкі не будуць вышэйшыя за сем паверхаў.

Недабудаваная стаматалагічная паліклініка сыдзе ў нябыт

Цяжка адшукаць у Мінску чалавека, які б не бачыў ці хаця б не чуў пра даўгабуд на вуліцы Платонава. Раней планавалася, што там размесціцца абласная стаматалагічная паліклініка. Яе ўзвядзенне пачалося яшчэ ў савецкія часы. Але будаўніцтва спынілася неўзабаве пасля знікнення СССР. І вось ужо амаль дваццаць гадоў у неба пагрозліва тырчаць штыры арматуры. Шмат дзе асыпалася цэгла, асабліва на тых участках, якія не абаронены ад дажджу і снегу. Але гэта не адпужвае графітыстаў — малюнкі на сценах відаць здалёк. Вялізны аб'ект расцягнуўся на дзясяткі метраў уздоўж праезнай часткі. Зірнуць на яго можа кожны: дастаткова праехацца на аўтобусе 37-га маршруту. І ўсё гэта знаходзіцца за нейкі кіламетр ад праспекта Незалежнасці.

Па словах **першага намесніка дырэктара фонда «Мінскаблдзяржмаёмасць» Святланы ДЗЕГЦЯРЭНКІ,** гэты даўгабуд хутка адправіцца на сметнік гісторыі:

— Сёлета 28 чэрвеня недабудаваны аб'ект па вуліцы Платонава ў Мінску быў прададзены на аўкцыёне. Згодна з зацверджанай горадабудаўнічай дакументацыяй, на гэтым месцы будзе ўзведзены адміністрацыйны будынак з гараж-стаянкай. Такім чынам, у мінулае нарэшце сыдзе чарговы знакаміты сталічны недабуд.

Руіны ў цэнтры горада

Але яўнай нечаканасцю стала адкрыццё закінутага паўразбуранага будынка па вуліцы Вызвалення, што знаходзіцца ў гістарычным цэнтры Мінска. Плот, якім гэты дом абнесены, стварае толькі ілюзію непрыступнасці. Бо праз колькі метраў ён... рэзка абрываецца, і патрапіць на аб'ект можа хто заўгодна. Ніякіх шыльдаў аб ахове тэрыторыі і забароне праходу не вісіць, і таму крочу туды па пратаптанай сцежцы.

А прайшоўшы два метры, адразу разумееш, якія «турысты» заходзяць сюды. На зямлі ляжыць старая падраная вопратка. Побач з ёй валяюцца цэлафанавыя пакеты, бутэлькі з-пад піва, гарэлкі і іншых напояў з градусамі, пакункі ад прэзерватываў. З-за кустоў праглядваюць пачкі з-пад цыгарэт. Але гэта што... З боку ад дома такія «залежы» можна здабываць у прамысловых маштабах. Некалькі вокнаў на першым паверсе закладзены ржавымі рашоткамі. Ды толькі якая ад іх карысць, калі сцяжынка вядзе акурат да праёма, які нічым не загароджаны? Унутр уваходзіць не стаў: пабаяўся. Ці мала які «сюрпрыз» можа там чакаць? Таму проста падставіў фотаапарат да праёма і націснуў на спуск.

Калі зірнуў на экран — зніякавеў. Убачыў на ім шкляныя і пластыкавыя бутэлькі, нейкія рызманы, бітыя цагліны, завалы рознага смецця.

Ды і сам будынак ведаў лепшыя часы. Нават з вуліцы відаць, што некаторыя цагліны ўжо выкрышыліся. Даўно аблезла тынкоўка. А з боку праходу будынак размалявалі графітысты. І да такога «прыгажуна» ісці ад станцыі метро «Няміга» (самы цэнтр горада!) усяго дзесяць хвілін...

Замест эпілога

Лёс закінутых пабудоў у пасёлку трактарабудаўнікоў і на вуліцы Платонава вядомы: праз пэўны час іх знясуць, а на іх месцы вырастуць сучасныя будынкі. Але вельмі засмуціла, што дом у гістарычным Ракаўскім прадмесці пакрысе ператварыўся ў паўразбуранае прыстанішча для гулянак, своеасаблівы шынок на адкрытым паветры ў цэнтры горада. Каторы год ужо стаяць гэтыя руіны, ва ўпор пазіраючы чорнымі прагаламі вокнаў на нешматлікіх прахожых...

Да прыкладу, у Пензенскай вобласці Расіі да праблемы закінутых дамоў знайшлі цікавы падыход. Такія будынкі будуць рамантаваць і перадаваць тым, хто мае ва ўласным жыллі вострую патрэбу — маладым і шматдзетным сем'ям. Ва ўсякім разе, такія дамы варта хоць бы абгарадзіць высокімі дэкаратыўнымі платамі — каб не псавалі ўражанне, ды і каб было бяспечна.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. Фота аўтара.

ТУРНІР ПАМЯЦІ РУСЛАНА САЛЕЯ ПАЧАЎСЯ Ў МІНСКУ

Учора на лёдзе «Мінск-Арэны» пачаўся першы турнір, прысвечаны памяці былога капітана хакейнай зборнай Беларусі Руслана Салея, які 7 верасня 2011 года разам з усёй камандай расійскага «Лакаматыва» загінуў у авіякатастрофе пад Яраслаўлем пры ўзлёце самалёта, які вылятаў на стартавы матч чэмпіянату КХЛ з мінскім «Дынама», паведамляе БЕЛТА.

На борце самалёта Як-42 акрамя Руслана Салея знаходзіліся яшчэ два беларусы — форвард Сяргей Астапчук і трэнер «Лакаматыва» па фізпадрыхтоўцы Мікалай Крываносаў.

Ужо на наступны дзень пасля трагедыі старшыня Федэрацыі хакея Яўген Варсін абвясціў аб заснаванні штогадовага турніру памяці Руслана Салея, а ў сярэдзіне ліпеня гэтага года быў названы канчатковы склад удзельнікаў першага такога спаборніцтва і стаў вядомы каляндар гульняў.

Турнір памяці Руслана Салея адкрыўся матчам, які прадстаўляе Беларусь у Кантынентальнай хакейнай лізе мінскага «Дынама» і чэмпіёна краіны жлобінскага «Металурга». Паядынак стартаваў у 19.00. А за паўгадзіны да гэтага пачаліся цырымонія адкрыцця турніру і прадстаўленне хакеістаў і трэнерскага штаба «Дынама» перад новым сезонам. Акрамя таго, у адкрыцці турніру прыняла ўдзел сям'я Руслана Салея, у тым ліку жонка хакеіста Бэттэн, якая прыбыла з-за акіяна.

У другі дзень турніру ў 17.00 адбудзецца матч «Металург» (Жлобін) — «Віцязь» (Чэхаў, Расія), які будзе трансліравацца на тэлеканале «Беларусь 2» у прамым эфіры.

У заключны дзень, 26 жніўня, у 17.00 пачнецца паядынак «Дынама» (Мінск) — «Віцязь» (Чэхаў). Яго тэлегледачы таксама змогуць убачыць на тэлеканале «Беларусь 2» у прамой трансляцыі.

Мінскае «Дынама» не гуляла на сваёй дамашняй арэне больш за паўгода — з 19 лютага, калі ўступіла пераможцу рэгулярнага чэмпіянату КХЛ чалябінскаму «Трактару». У міжсезонне склад сталічнай дружыны папоўнілі некалькі навабранцаў — абаронцы Коры Мэрфі (Канада), Юнас Фрэгрэн (Швецыя) і беларусы Павел Чарнавок і Яўген Нагачоў, а таксама форварды Цім Стэплтан (ЗША) і беларус Андрэй Коласаў. Акрамя таго, залечыў траўму спіны, прапусціўшы амаль увесь папярэдні сезон, беларускі выхаванец чэшскага хакея Анатоль Пратасеня. А галкіпера Андрэя Мезіна, які развітаўся з камандай, замяніў варатар зборнай Нарвегіі Ларс Хаўген, які амаль увесь мінулы сезон гуляў у беларускай экстралізе за салігорскі «Шахцёр» і толькі ў канцоўцы чэмпіянату КХЛ прызваны пад дынамаўскія сцягі.

На жаль, з-за ўкусу кляшча вымушаны быў прапусціць большую частку цяперашняй перадсезоннай падрыхтоўкі лідар каманды чэшскі форвард Збынек Іргл, таму ён наўрад ці згуляе на турніры памяці Руслана Салея.

А вось нападаючыя Джэф Плат і Дзмітрый Мялешка, якія атрымалі траўмы на нядаўнім трэніровачным зборы ў Швейцарыі, ужо аднавілі трэніроўкі з камандай.

Цікава, што мінскае «Дынама», якое лічыцца флагманам беларускага хакея, папярэдні раз сустракалася з пераможцам экстралігі 4 гады таму, напярэдадні дэбюту ў КХЛ. Тады «зубры» пацярпелі цяжкае паражэнне ад мінскага «Кераміна» — 2:6, пасля чаго перацягнулі ў свае шэрагі ледзь не палавіну ігракоў саперніка.

Пасля таго канфузу мінскае «Дынама» імкнулася пазбягаць сустрэч з чэмпіёнамі Беларусі, нягледзячы на настойлівыя прапановы галоўнага трэнера мінскага «Юнацтва» Міхаіла Захарава. Зрэшты, у мінулым сезоне яго дружына пазбавілася чэмпіёнскага тытула і цяпер рыхтуецца да дэбюту ў Вышэйшай хакейнай лізе (ВХЛ) адкрытага чэмпіянату Расіі, а матч мінскага «Дынама» з чэмпіёнам краіны (гэты тытул вясной упершыню завяваў жлобінскі «Металург») усё ж адбудзецца — у рамках турніру памяці Руслана Салея.

Ударна жлабінчане пачалі падрыхтоўку і да новага сезона, упэўнена заваяваўшы пуцёўку ў фінал Кубка Беларусі. Будзе цікава паглядзець, як каманда вытрымае выпрабаванне клубамі КХЛ — мінскім «Дынама» і падмаскоўным «Віцязем». Са страт «Металурга» адзначым адсутнасць траўміраванага абаронцы Ілыі Казнадзея.

Чэхаўскі «Віцязь», які за гады выступлення ў КХЛ праславіўся шалёным норавам і пастаяннымі бойкамі, уступае ў новы сезон пад кіраўніцтвам новага галоўнага трэнера — 49-гадовага Юрыя Лявонава, вядомага па выступленнях за маскоўскае «Дынама» і зборную СССР, з якой у 1990 годзе заваяваў золата чэмпіянату свету.

У міжсезонне «Віцязь» папоўніўся маладымі здольнымі гульцамі, у каманду вярнуліся таксама вопытныя хакеісты — абаронца Данііл Маркаў і форвард Аляксандр Карарлюк.

Атрад тафгаяў «Віцязя» прыкметна скараціўся. Кошт білетаў на асобныя матчы турніру памяці Руслана Салея складзе ад Br10 тыс. да Br80 тыс. Комплексныя білеты на ўсе паядынкі турніру прадаюцца па цане ад Br45 тыс. да Br186 тыс.


Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.
Fe+C
Sn+Pb
Ag+Hg
Ni+Fe+Mn
Fe+Ni
Фота 5
Фота 3
Адзін з мушкецёраў
Зялёнае покрыва зямлі
Горад у Латвіі
Прысуд шахматнаму каралю
Людзі аднаго колеру скуры
Мастацтва Мельпамены
Прадукт з заквашанага малака
Кропка на нябеснай сферы
Карціна на століе
Прысваенне чужой упаснасці
Орган мышлення ў чалавека
Зорная песня А.Пугачовай
Горы побач з Альпамі
Марка камбайна
Рада-слоўнае ...
Алправа карціны
Рака ў Кітаі і Казахстане
Фота 4
Насценны асвятляльнік
Вельмі небяспечная змяя
Кампазітар Напалеон ...
Рыба для вэнджання
Жыллё кітайца
У руцэ ў аўтаінспектара
Пастушковы журавель
Паляр-ная качка
Ядавітае пустазелле
Духмяная расліна
Аснова збудавання
Сябар Чабурашкі
Адзенне даўняга рымляніна
Фота 1
Марка фотаапарата
Землякоп
Былая Бірма
Сталіца Казахстана
Бог-творца ў егіпцян
Акруга ў старажытным Егіпце
Прадукт з вулея
Дама, валет, туз
Дужы, плячысты мужчына
Будаўнічы камень
Прапанова, пажаданне
Падводная небяспека
Рускі народны танец
Фота 2
Індзейскае племя
Сумка грыба
Рака ў Заходняй Афрыцы
Вышэйшы гатунак хрусталю
Неабвержная ісціна
Блізняты, ..., Леў
Бацька
Вестыбулярны ...
Два падобныя прадметы
Сродак сувязі
Парусны 3-мачтавы карабель
Абмежаванная частка лінеі
ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ
На гарызанталі: Амальгама. Тэатр. Сыр. Анекс. Ілі. Дзява. Рама. Фанза. Орда. Воўча. Жазло. Гена. Гарэза. Тунэль. Гразь. Бар. Ном. Восск. Гарадза. Карта. Быт. Аск. Дакт. Чыгун. Рак. Апарат. Пара. Акат. Эфа. Крапак. Гразь. Арэкс. Пано. Бакара. Ане. Тата. Мат. Кражка. Пта. Раса. Луда. Фаэс. Адразак.
На вертыкалі: Мельхіёр. Гага. Кры. Інвар. Мозг. Рыф. «Арэкіна». «Дон». «Кодак». Юра. Арама. Таганак. Аса. Аватар. Бра. Астана. Атос. Кардас.

■ Здарэнні

Жыхарку Малых Аўцюкоў забіў кавалер

Да праваахоўнікаў раніцай звярнулася сястра жыхаркі вёскі Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага раёна, калі тая звечара не вярнулася дадому.

Міліцыя пачала пошук. Тэрыторыю вёскі «прачэсвалі» міліцыянеры разам са сваякамі. Труп дачкі знайшоў бацька. Цела было прысыпана зямлёй і лісцем недалёка ад дарогі. Як расказала афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага Камітэта РБ па Гомельскай вобласці Марыя Крываногава, на целе ахвяры знойдзена мноства колата-рэзаных ран у вобласці грудной клеткі і спіны. Тым часам сталі вядомыя некаторыя падрабязнасці трагедыі.

Напярэдадні 35-гадовая жанчына ужывала спіртныя напоі з непрацуючым 24-гадовым аднавяскоўцам. Апошні ўжо меў судзімасці за рабаванне і разбой. Пасля ён рашыў правесці жанчыну дадому, але па дарозе яны пасварыліся. Малады чалавек нажом стаў наносіць удары жанчыне.

Пасля забойства ён схаваў труп у хмызняку і знік, але ж неўзабаве быў затрыманы. Па гэтым факце заведзена крымінальная справа па артыкуле аб забойстве з асаблівай жорсткасцю. Для поўнага і аб'ектыўнага расследавання прызначаны шэраг экспертыз.

Ірына АСТАШКЕВІЧ
■

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	Вибросито ВС-3С стоимостью 1 914 000 рублей.
Собственник (владелец) имущества	СООО «Сообщество делового сотрудничества» УНП 391000523
Местонахождение (адрес) имущества	г. Полоцк, ул. Суворова, 1а
Наличие обременений	залог ОАО «БПС-Сбербанк»
Место (адрес), дата и время проведения торгов	С 9.00 20 сентября 2012 года по 18.00 29 сентября 2012 года на интернет-портале хозяйственных судов Республики Беларусь **http://court.by/sales/**
Справочная информация об организаторе торгов	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 321, **http://court.by/vitebsk/** Судебный исполнитель Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс (80212) 49 13 49, (8 029) 663 53 24, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 (8044) 746 73 00
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, в течение 15 дней со дня, следующего за днем размещения публичного извещения об электронных торгах на Интернет-портале хозяйственных судов Республики Беларусь, обязано пройти регистрацию. Для регистрации на сайте лицо знакомится с порядком проведения торгов, дает подписку об отсутствии препятствий для участия в торгах в соответствии со статьей 384 ХПК, перечисляет задаток в размере 10% от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670 не позднее 14.09.2012 и заполняет заявление. Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС http://court.by/vitebsk/divestiture/, http://court.by/ sales/.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ, РАСПОЛОЖЕННОГО В БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ

Наименование предмета аукциона	Участок межплощадочного блокировочного трубопровода в Пружанском районе Брестской области
Местонахождение недвижимого имущества	**Пружанский район, направление Щерчово-Свислочь, межплощадочный блокировочный трубопровод Сухопольский сельсовет:** 2,7 км северо-восточнее дер. Попелево; 0,5 км восточнее дер. Попелево; 0,15 км юго-восточнее дер. Попелево; 0,46 км юго-восточнее дер. Попелево; 2,5 км восточнее дер. Чадель; 1,0 км северо-западнее дер. Приколесь; 0,7 км юго-западнее дер. Приколесь; 1,0 км восточнее дер. Хвалово; 0,35 км юго-западнее дер. Чепели; 0,35 км юго-западнее дер. Чепели; 0,7 км юго-западнее дер. Приколесь **Шерешевский поссовет:** 0,2 км юго-западнее дер. Купичи, северо-западнее г.п. Шерешево, 1,6 км севернее г.п. Шерешево. **Великосельский сельсовет:** 2,5 км юго-западнее дер. Залесье **Щерчовский сельсовет:** 1,1 км восточнее дер. Александровка
Продавец недвижимого имущества	Государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», тел. (0163) 41 28 05, 41 25 92, 41 26 78
Сведения о предмете аукциона	Межплощадочный блокировочный трубопровод (трасса № 1 (пл.2/2 - пл.1-С), протяженность 43689,2 м. Земельные участки площадью соответственно 2,0658 га, 0,0714 га, 0,0026 га, 0,2531 га, 1,6706 га, 0,2794 га, 0,4893 га, 0,5203 га, 0,1785 га, 0,7180 га, 0,2032 га, 0,3942 га, 0,5280 га (ограничения в связи с расположением в границах охранных зон особо охраняемых природных территорий (охранная зона ГПУ «Национальный парк «Беловежская пуща» на всей площади); 1,5273 га (ограничения на площади 0,3676 га в связи с расположением в водоохранной зоне водных объектов (водоохранная зона р. Лесная Левая), в охранных зонах линий электропередачи напряжением 110 кВ на площади 0,0199 га); 0,9917 га (ограничения на площади 0,0846 га в связи с расположением в водоохранной зоне водных объектов (водоохранная зона р. Лесная Левая); 1,5673 га; срок аренды – 10 лет
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка	● осуществить государственную регистрацию права на земельные участки в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельных участков; ● в случае демонтажа межплощадочного блокировочного трубопровода разработать проектно-сметную документацию на демонтаж, на рекультивацию земельных участков и получить в установленном порядке разрешение Пружанского районного исполнительного комитета на производство работ по демонтажу межплощадочного блокировочного трубопровода; ● до окончания срока аренды земельных участков совместно с Пружанским районным исполнительным комитетом решить вопрос его дальнейшего использования
Начальная цена предмета аукциона, руб.	4 041 756 828
Задаток для участия в аукционе, руб.	808 000 000
Организатор аукциона	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 21 19 82, 23 44 06, 23 44 78, 23 12 63, 20 87 85 www.brest-region.by, www.gki.gov.by

Аукцион проводится 25 сентября 2012 года в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе организатору аукциона подается:

Заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка на р/с 3642941148018 дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Брестской области (код 739), получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (*кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель*) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками - оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов предъявляется:

заявителем (его представителем) - документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия;

уполномоченным лицом консолидированных участников (его представитель) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

При подаче заявления с приложением необходимых документов с организатором аукциона заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовке и проведения аукциона по установленной форме.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол в день аукциона; в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, представить организатору аукциона, продавцу, и в местный исполнительный комитет копии платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, и с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Земельный участок предоставляется победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) в аренду без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договора аренды.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, с учетом норм Декрета Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413 фонд «Брестоблимущество» по рабочим дням с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 24 сентября 2012 года включительно.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

Наименование объекта	Изолированное помещение
Местонахождение объекта	Брестская обл., Ивановский р-н, д. Потаповичи, ул. Школьная, 2
Продавец объекта	Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», тел. 80162 20-52-37, 20-57-21, 22-06-13
Начальная цена продажи, руб.	3 525 595
Сумма задатка, руб.	352 000
Сведения об объекте	Изолированное помещение в 1-этажн. здании смешанной конструкции (блок, кирпич); площадь 79,7 кв.м; ½ доля пристройки кирпичной
Организатор торгов	Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 80162 20-87-85, 23-12-63, 23-44-78, www. brest–region.by

Аукцион состоится **25 сентября 2012 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с 3642941148018 дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Брестской области, код банка 739, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе.

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов.

5. Иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык.

6. Представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Порядок проведения аукционных торгов определен Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30.03.2009 № 36.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413, фонд «Брестоблимущество» по рабочим дням с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по 24 сентября 2012 г. включительно.

СОАО «Минский завод автомобильной комплектации» объявляет тендер на проведение проектно-изыскательских работ по объекту «Тепловая модернизация административного здания по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123». Предложения принимаются в течение 7 дней со дня публикации по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123, тел./факс 205 86 00, тел. 205 85 26. Тельтевский В.Н.
УНП 190050257

ЦАНА ПАПЕРКІ

Грамадзянін Польшчы, які прыбыў на тэрыторыю нашай краіны па чыгунцы, не запоўніў мытную дэкларацыю, хоць яму гэта прапаноўвалі зрабіць. На выснае пытанне супрацоўніка Брэсцкай мытні адносна колькасці валюты, госць назваў лічбу, якая адпавядае прыкладна шасці тысячам долараў. А калі багаж праверылі, то знайшлі валюты больш як на 10 тысяч долараў. Грошы канфіскавалі ў адпаведнасці з мытным заканадаўствам.

Яна СВЕТАВА.

Утерянный бланк приходного кассового ордера КО-1в, серии ДТ № 0000750, принадлежащий ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», считать недействительным.
УНП 101063229

Распаліў няўдала вогнішча...

У Гомельскай вобласці пры распальванні вогнішча пры дапамозе бензіну сур'ёзна пацярпеў мужчына.

Пацярпелы, 30-гадовы індывідуальны прадпрымальнік, адпраўваў на возеры Камарына, што за два кіламетры ад Рагачова. Раскладваючы ўвечары вогнішча, вырашыў аблегчыць справу пры дапамозе бензіну. Пары ўспыхнулі, і ў выніку мужчына атрымаў апёкі першай-трэцяй ступені абедзвюх рук, тулава, галавы (20 працэнтаў паверхні цела). Зараз грамадзянін знаходзіцца ў рэанімацыйным аддзяленні Рагачоўскай цэнтральнай раённай бальніцы. Стан яго ўрачы ацэньваюць як цяжкі...

Сяргей РАСОЛЬКА.

УТВЕРЖДЕНО
Общим Собранием Участников
ИООО «Белинтерросинвест»
02.08.2012 года
(протокол № 48)

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой продаже жилищных облигаций девятого, десятого и одиннадцатого выпусков Иностранного общества с ограниченной ответственностью «Белинтерросинвест» (ИООО «Белинтерросинвест»)

Раздел 1. Общие сведения об эмитенте

1. Наименование эмитента.

На белорусском языке:

полное наименование: Замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Белінтаррасінвест»;

сокращенное наименование: ЗТАА «Белінтаррасінвест».

На русском языке:

полное наименование: Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Белинтерросинвест» (далее по тексту – эмитент);

сокращенное наименование: ИООО «Белинтерросинвест».

2. Место нахождения эмитента: 220020, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Пионерская, д. 32, пом. 2Н; **телефон**: (017) 228-52-18; **факс**: (017) 228-52-18; **электронный адрес** (e-mail): biri@tut.by.

3. Основной вид деятельности эмитента:

согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006

70110 – Подготовка к продаже недвижимого имущества.

Эмитент вправе осуществлять функции заказчика (застройщика) согласно примерного перечня функций заказчика, застройщика в строительной деятельности, утвержденного 20.05.2011 года Постановлением Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь № 25.

4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи, наименование обслуживающего банка: р/с № 3012004871004 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32, код 226.

5. Бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном пунктом 8 Инструкции о порядке представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации, утвержденной постановлением Министерства финансов Республики Беларусь от 21.12.2010 г. № 157 «О некоторых вопросах представления и публикации участниками рынка ценных бумаг отчетности и иной информации», в соответствии с законодательством в периодическом печатном издании не публиковалась и ее опубликование не требуется.

6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента: ОАО «Банк БелВЭБ» (далее по тексту – депозитарий).

Место нахождения депозитария: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, ком. 607. Зарегистрирован Национальным Банком Республики Беларусь 12 декабря 1991 года, регистрационный номер 24.

Специальное разрешение (лицензия) № 02200/5200-124-918 выдано Министерством финансов Республики Беларусь 29 июля 2002 г. Срок действия специального разрешения (лицензии) продлен на основании решения №243 от 13 июля 2007 г. и решения №155 от 24 мая 2012 г. Срок действия лицензии до 29 июля 2022 г.

7. Размер уставного фонда эмитента: 20 000 (Двадцать тысяч) долларов США (уставный фонд сформирован в размере 100%).

8. Дата и номер государственной регистрации эмитента, наименование органа, его зарегистрировавшего.

Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Белинтерросинвест» зарегистрировано 22 марта 2010 г. Минским городским исполнительным комитетом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191299183.

9. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии.

Ознакомиться с Проспектом эмиссии облигаций можно ежедневно (кроме выходных и нерабочих праздничных дней) с 9:00 до 12:30 и с 14:00 до 15:00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленные нерабочими – с 9:00 до 12:30) начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций:

- в ИООО «Белинтерросинвест» по адресу: г. Минск, ул. Пионерская, д. 32, пом. 2Н;

- в ОАО «Банк БелВЭБ» по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

10. Решение о выпуске жилищных облигаций девятого, десятого и одиннадцатого выпусков принято 02.08.2012 года Общим Собранием Участников (**протокол №48**).

11. Объем эмиссии жилищных облигаций составляет:

девятого выпуска – 1 980 693 000 (Один миллиард девятьсот восемьдесят миллионов шестьсот девяносто три тысячи) белорусских рублей;

десятого выпуска – 1 018 052 680 (Один миллиард восемнадцать миллионов пятьдесят две тысячи шестьсот восемьдесят) белорусских рублей;

одиннадцатого выпуска – 21 468 062 000 (Двадцать один миллиард четыреста шестьдесят восемь миллионов шестьдесят две тысячи) белорусских рублей.

Количество жилищных облигаций:

девятого выпуска – 195 (Сто девяносто пять) штук;

десятого выпуска – 92 (Девяносто две) штуки;

одиннадцатого выпуска – 2030 (Две тысячи тридцать) штук.

12. Номинальная стоимость одной жилищной облигации:

девятого выпуска – 10 157 400 (Десять миллионов сто пятьдесят семь тысяч четыреста) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (однокомнатные квартиры жилого дома №2.3 в составе «Комплекса»);

десятого выпуска – 11 065 790 (Одиннадцать миллионов шестьдесят пять тысяч семьсот девяносто) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (трехкомнатная квартира жилого дома №2.3 в составе «Комплекса»);

одиннадцатого выпуска – 10 575 400 (Десять миллионов пятьсот семьдесят пять тысяч четыреста) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный одному квадратному метру общей площади жилого помещения (квартиры жилого дома №2.2 в составе «Комплекса»).

13. Открытая продажа (размещение) жилищных облигаций **девятого** выпуска проводится **с 29 августа 2012 года по 21 января 2013 года.**

Открытая продажа (размещение) жилищных облигаций **десятого** выпуска проводится **с 29 августа 2012 года по 28 марта 2013 года.**

Открытая продажа (размещение) жилищных облигаций **одиннадцатого** выпуска проводится **с 29 августа 2012 года по 21 июня 2013 года.**

14. Срок обращения облигаций девятого выпуска с 29 августа 2012 года по 31 января 2013 года включительно (155 календарных дня).

Срок обращения облигаций десятого выпуска с 29 августа 2012 года по 5 апреля 2013 года включительно (219 календарных дней).

Срок обращения одиннадцатого выпуска облигаций с 29 августа 2012 года по 30 июня 2013 года включительно (305 календарных дней).

15. Проведение открытой продажи (размещения) жилищных облигаций осуществляется ОАО «Банк БелВЭБ» ежедневно (кроме субботы и воскресенья, а также за исключением государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 9:00 до 12:30 и с 14:00 до 15:00 (в пятницу, а также в дни, предшествующие выходным и праздничным дням, объявленные нерабочими – с 9:00 до 12:30) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, каб. 607.

16. Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 21.08.2012 года.

Регистрационный номер: 5-200-02-1608.

Регистрационный номер: 5-200-02-1609.

Регистрационный номер: 5-200-02-1610.

Генеральный директор
ИООО «Белинтерросинвест» **П.Г. Козлов**

Главный бухгалтер **Н.С. Листратенко**

ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ

Штосуботу «Звязда» будзе ладзіць СУБОТНІК. Каб гумарам, смехам, сатырай, іроніяй рабіць «зачыстку» чарноццю, выкрываць непагадзь жыцця — ва ўсіх праявах, асобах, сітуацыях...

А дапамагаць нам будуць калегі з «Вожыка» — часопіса, які больш чым за сем дзесяцігоддзяў набыў рэпутацыю самага ўплывовага сатырычна-гумарыстычнага часопіса краіны.

Дарэчы, пачынаўся сам часопіс з газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», якую выдавала рэдакцыя газеты «Звязда». Так што мы зноў разам!

Паважаныя чытачы, запрашаем і вас паўдзельнічаць у СУБОТНІКУ!



Рубрыку вядзе Дунька ШЫП.

Васіль ФЕРАНЦ

НЯЎДАЧНІК

Гумарэска

Нядаўна я набыў дачны ўчастак. Каля лесу. Ажно чатыры соткі... Пачаў памалу абжываць яго — пні карчаваць, хмызняк высякаць, зямлю апрацоўваць. А мой сусед тым часам — цагліна за цаглінаю, ужо дамок узводзіць. І не абы-які, а двухпавярховы. Пад дах ужо бярэцца, хутка, глядзіш, і наваселле спраўляць будзе. Калі ён паспеў, дзе матэрыялы бяруць? Ды і цэны цяпер ого як кусаюцца!

Зайшоў да яго, пачаў распытваць: падзяліся, маўляў, вопытам...

— А ўсё таму, — не стаў утойваць ён, — што я па жыцці вельмі няўдачлівы... Не шанцуе мне. Дзе б ні ехаў, ні ішоў, толькі і глядзі, каб цагліна на галаву не звалілася. І валяцца. Добра, калі побач... Ну, што мне застаецца? Пакладу ў партфель, прынясу дахаты. За тыдзень з дзясятак назбіраецца. У выхадны дзень вязу сюды ды кладу сцяну. Так вось паціху і рухаецца справа...

— Дык тая цагліна можа і на галаву ўпасці...

— О, колькі разоў! От паглядзі, — сусед зняў шапку, і я ўбачыў на яго галаве гузакі, шрамы, невялікія і нават адметныя раны, даўнія і зусім свежыя.

— І на нагу цагліны падалі, — працягваў сусед. — Нездарма вунь лева карацейшая за правую. Адночы плячо перабіла...

— Сапраўды, нейкі ты няўдачлівы. Але ж, акрамя цэглы, патрэбны і іншыя матэрыялы. Дошкі там, бэлькі, дзверы...

— Гэтак сама! І ўсё таму, што не шанцуе мне... Іду неяк па вуліцы, а мяне абганяе машына, даверху нагружаная дошкамі. На яме грузавік калыхнуўся — і дошкі абрынуліся на мяне, прысыпалі... А машына хоць бы што, далей паехала. Што мне заставалася? Так-сяк выбраўся з-пад завалу, нагу тады вывіхнуў і вось гэтую рану на галаве, каля вуха, атрымаў. Давялося тыя дошкі прывезці сюды — вось табе і стол, і падлога...

— А дзверы?

— Я ж кажу: не шанцуе мне. Непадалёк ад майго дома ў горадзе таксама вядзецца будоўля. Кранам падымалі дзверы на паверх, адны і ўпалі. Ледзь не на мяне... Потым будаўнікі ўстаўлялі ў доме вокны. Дрэнна замацавалі іх, узняўся вецер — і некалькі выдзьмула скразняком. Адно акно ўпала каля майго пад'езда, другое — проста на балкон. Перавёз сюды... Вось чакаю, дах пачнуць хутка крыць, падыду, можа, што ўпадзе. Які рулон толю ці металачарапіца. Мне толь цяпер патрэбны...

«Ну і сапраўды, — падумаў я, — няўдачлівы нейкі мой сусед. Не шанцуе яму».

А можа, і мне паспрабаваць хадзіць побач з будоўлямі?..

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Тыдзень можа забяспечыць добрыя ўмовы для практычнай і інтэлектуальнай дзейнасці, але не варта забывацца і пра завяршэнне даўніх спраў. Своечасовае праяўленне ініцыятывы на працы будзе спрыяць наступнаму кар'ернаму росту. Прымайце актыўны ўдзел у рашэнні пытанняў і на працы, і дома.

ЦЯЛЕЦ. Увесь тыдзень вас будуць крытыкаваць з усіх бакоў — і самае крыўднае, што амаль кожны раз крытыка будзе справядлівай. Давядзецца вырашаць задачу з двума невядомымі: ад правільнага адказу будзе залежаць, ці адкрыюцца перад вамі новыя магчымасці. Не спяшайцеся браць на сябе кіраўніцтва ці займаць адказную пазіцыю, таму што зайздроснікі і інтрыганы толькі і чакаюць, што вы паслізняцеся.

БЛІЗНЯТЫ. Дайце свайму акружэнню больш волі ў выбары, не цісніце на блізкіх сваім аўтарытэтам. Цярпенне пераможа ўсё. Не адкладайце ніякіх спраў дзеля балбатні з чалавекам, якога вы даўно не бачылі: гэта можа прывесці да вельмі вялікай памылкі. У сярэдзіне тыдня пачне шанцаваць у справах, якія патрабуюць творчай ініцыятывы.

РАК. Вы, верагодна, ужо зразумелі простую праўду: каб атрымліваць задавальненне ад зносін з людзьмі, трэба навучыцца не толькі прымаць, але і дарыць, прычым ад шчырага сэрца. З'явіцца магчымасць пацвердзіць гэта. Будзьце прадбачлівыя пры зносінах з начальствам: вашы веды і кампетэнтнасць не павінны занадта рэзаць вока.

ЛЕЎ. Шматлікія пытанні, якія вас хвалююць, спрыяльна вырашацца. Праявіце асцярожнасць да новых ідэй. Не выключана, што сябры перакінуць на вашы плечы нейкую праблему. Ні ў якім выпадку не варта расходаваць каштоўную энергію дарма: яе будзе мала, а спраў — шмат. Сканцэнтруйцеся на асноўнай мэце, і тады любая перашкода будзе пераадольная.

ДЗЕВА. Вы нарэшце адчуеце сілу для новых здзяйсненняў — гэта дазволіць прыняць удзел у розных праектах і ў рашэнні самых незвычайных пытанняў, пра якія вы раней і думаць не маглі. Разнастайны запас ідэй дапаможа выявіць сябе ў якасці лідара, заадно праявіўшы свае арганізатарскія здольнасці. Тыдзень будзе насычаны кантактамі, паездкамі, сустрэчамі і знаёмствамі.

ШАЛІ. Не бойцеся прыступаць да рэалізацыі новых праектаў, але пры гэтым суразмервайце свае сілы з рэальнасцю, каб не пачаць валіцца ад знясілення ўжо да чацвярга. Паглыбляючыся ў працу, не забывайцеся, што існуюць і іншыя жыццёвыя сферы, якія могуць запатрабаваць ад вас пільнай увагі. У другой палове тыдня не выключана частковая змена дзейнасці. У суботу не пажадана паддавацца залішняй мітусні і паніцы, інакш каштоўны час растраціце па дробязях.

СКАРПІЁН. Вас чакаюць цікавыя падзеі. Улавіце кірунак ветру змен, каб па максімуме не выпусціць спрыяльных магчымасцяў. Заставайцеся сумленным перад сабой і блізкімі, і тады ніякія чуткі не змогуць нашкодзіць. Можаце адчуць, што назапашаныя справы адкласці ўбок нельга. Загадзя выразна сплануйце час: тады атрымаецца зрабіць усё, што неабходна.

СТРАЛЕЦ. Важна захоўваць спакой і ўраўнаважанасць. Назірайце за плынню жыцця і не прыспешвайце падзей. Не варта нічога рабіць назло навакольным, як моцна вам бы гэтага ні хацелася. Яма, выкапаная іншаму, абавязкова апынецца на вашым уласным шляху. Нядрэнна б намякнуць начальству пра яго завышаныя патрабаванні. Выхадныя дні спрыяльныя для прывядзення ўсіх спраў у парадак.

КАЗЯРОГ. Магчыма ўсё: і прывабныя перспектыўныя прапановы, і выбух папулярнасці ў шырокім коле, і падтрымка ўплывовых людзей. Аўторак можа быць адзначаны спакусай навізны — гэты дзень добра правесці ў дарозе. Паспрабуйце хоць бы да чацвярга не абвастраць адносін з калегамі па працы, і тады ва ўсім будзеце мець поспех. У выхадныя дні ваша практычнасць будзе на вышыні, але асцерагайцеся апусціцца да дробязнасці.

ВАДАЛЕЙ. Спрыяльна будаваць любыя планы на найбліжэйшую будучыню. Добры час для пашырэння сувязяў. З начальствам лепш не спрачацца, нават калі вельмі хочацца — паспрабуйце пазбегнуць гутаркі і перанясіце дыскусію на іншы, больш удалы для гэтага час. На пачатку тыдня завяршыце неадкладныя справы, а з новымі задумамі пачакайце да серады. Верагодныя некаторыя змены ў жыцці: вам могуць прапанаваць змяніць працу. Гэта добрая прапанова: яна дазволіць гучна заявіць пра сябе ў прафесійным плане.

РЫБЫ. Тыдзень нялёгкі, але ніякіх асаблівых непрыемнасцяў не абяцае. Ваша назіральнасць істотна павялічыцца — гэта дапаможа быць выдатным псіхолагам. У аўторак і сераду чакаецца шмат зносін, новых знаёмстваў, важных сустрэч і нарад. У чацвер будзьце пільнымі, бо магчымыя спакусы і ілюзіі. Зменшыце працоўную нагрузку да разумнага мінімуму, па магчымасці, нават вазьміце выхадны ў гэты дзень. Ужо ў пятніцу вы адчуеце прыліў сіл і настрой палепшыцца.

ФОЛК-ФЭСТ «КАМЯНІЦА» ЗБІРАЕ АМАТАРСКІЯ АНСАМБЛІ

Чацвёрты фолк-фестываль «Камяніца» адбудзецца 15 верасня на тэрыторыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў вёсцы Азярцо пад Мінскам. У гэтым годзе ўпершыню акрамя вялікай прафесійнай сцэны будзе працаваць сцэна для аматарскіх калектываў.

Да ўдзелу запрашаюцца дзіцячыя, падлеткавыя і дарослыя калектывы. Гэта могуць быць хары, ансамблі, групы, у тым ліку пачынаючыя. Галоўная ўмова — уменне выконваць традыцыйныя беларускія песні, імкненне захаваць жывую нацыянальную культуру.

Фолк-фэст «Камяніца» заснаваны ў 2009 годзе. Яго мэта — прапаганда традыцыйнай культуры і дапамога музею народнай архітэктуры і побыту, на тэрыторыі якога знаходзіцца ўнікальная калекцыя аўтэнтычнай беларускай драўлянай архітэктуры XVIII-XX стагоддзяў. Усе грошы, атрыманыя ад продажу білетаў, будуць накіроўвацца на рахунак гэтай установы.

Сёння экспазіцыю музея пад адкрытым небам, які разгарнуўся на плошчы 151 га, складаюць больш як два дзясяткі помнікаў. Іх падтрыманне і захаванне патрабуе значных фінансавых затрат. Часткова рамонт фінансуецца дзяржавай, некаторыя сродкі музей атрымлівае ад аказання платных паслуг (правядзення свят і масавых мерапрыемстваў), вялікае значэнне мае спонсарская дапамога.

Як і ў мінулым годзе, для гледачоў у нацыянальных касцюмах уваход будзе бясплатным.

БЕЛТА.

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

Міхась МІРАНОВІЧ

МІРАНІЗМЫ

Мужык у хаце

Сяброўка
Раіла Агаце:
— Павінен быць
Мужык у хаце!..
— Так, мужыка б
Някепска мець!..
Вось толькі мужа
Дзе падзець?!.

Прызнанне

Вы майце, дзяўчаты,
На ўвазе,
Як жыць мне нялёгка
Даводзіцца:
Даўно я не быў
У экстазе —
Забыў ужо,
Дзе ён знаходзіцца...

Не мяне...

— Пабачыш, —
Злева чуў і справа, —
Цябе, няйнакш,
Чакае слава!..
— Пабачыў —
Стала сумна мне:
Яна чакала
Не мяне!..

Не чужая

— Любая,
Не лайся без прычын,
Што хаджу я
Да чужых жанчын.
У суседкі быў я,
Дарагая.
А суседка — наша,
Не чужая!

Прыгажосць уратуе свет

А праўда
Ў гэтых словах ёсць —
Аддам належнае
Красе:
Свет уратуе
Прыгажосць,
Але ўратуюцца
Не ўсе!..

Не ў сваёй талерцы

Глынуўшы лішку,
На вяселлі сват
Упаў суседу
Тварам у салат.
Кума Анэта
Кажа свацці Верцы:
— Здаецца, сват наш
Не ў сваёй талерцы!..

Мімаходзь

- Калі табе няма чаго губляць, першай губляецца трывога.
- Дурні шукаюць лепшыя месцы. Разумныя — займаюць іх.
- Тое, чаго ты хочаш, — не збываецца. Тое, чаго ты не хочаш, — збываецца. Значыць, трэба не хацець таго, што не збываецца.
- Мужчына павінен аддаваць жанчыне без астатку сэрца, душу і кашалёк.
- Ніколі не спрабуйце спыніць сабаку, які брэша, і жанчыну, якая плача. Працэс толькі ўзмацніцца.
- Сапраўдны зайздроснік пазайздросціць нават магільнаму помніку суседа.
- Чарвяк не любіў рыбалку, але яго заўсёды бралі з сабой.
- Ніколі не ўкладвайце грошы ў тое, што ўмее бегаць.

Дунька ШЫП,
г. Мінск.

Малюнак Пятра КОЗЫЧА.

Даты. Падзеі. Людзі

1762 год — нарадзіўся Ян Рустэм, жывапісец, педагог. Творчасць была звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Літвы. Вучыўся ў Варшаве і Германіі. У 1798-1832 гадах выкладаў у Віленскім універсітэце. Рэарганізаваў сістэму навучання ў Віленскай мастацкай школе. Падрыхтоўка ў гэтай установе давала магчымасць таленавітай моладзі Беларусі, Літвы і Польшчы паступаць у мастацкую акадэмію. Толькі ў 1820-1822 гадах у школе вучыліся 45 жывапісцаў і 16 скульптараў, сярод якіх было шмат выхадцаў з Беларусі. Выхаванцамі школы былі В. Ваньковіч, Я. Дамель, Н. Орда, І. Хруцкі і іншыя вядомыя творцы. Сам Рустэм працаваў пераважна ў жанры партрэта. Ён аўтар шматлікіх аўтапартрэтаў, партрэтаў Т. Зана і іншых, акварэляў. Памёр у 1835 годзе.



1698 год — з-за мяжы пасля амаль паўтара года адсутнасці вярнуўся Пётр I. Што дало цару падарожжа ў Еўропу? Многія лічаць, што менавіта там ён канчаткова «выспеў» як рэфарматар. Пераўтварэнні пачаліся з «культурных новаўвядзенняў». Ужо на наступны дзень Пётр Аляксеевіч на ўрачыстым прыёме ў сяле Праабражэнскім увёў усіх у шок, пачаўшы рэзаць падданым бароды і кафтаны. Спачатку ён уласнаручна пагаліў генералісімуса Шэіна, другім быў князь Рамаданаўскі, а потым і астатнія. Словам, праз тры дні на вечары ў Лефорта барадатых не аказалася.

1935 год — нарадзіўся (г.п. Урэчча Любанскага раёна) Коршук Уладзімір Канстанцінавіч, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук (1980), прафесар (1982), заслужаны работнік адукацыі Беларусі (2000). Аўтар даследаванняў па сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі, праблемах грамадскіх адносін, гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Адзін з аўтараў кніг «Беларусь на мяжы тысячагоддзяў», «Беларусізацыя, 1920-я гады: дакументы і матэрыялы», «Палітычныя партыі Рэспублікі Беларусь» і іншых.

Было сказана

Кастусь Каліноўскі (1838—1864), беларускі рэвалюцыйны дэмакрат, паэт, публіцыст:

«Няма, браткі, большага шчасця на гэтым свеце, як калі чалавек мае розум і навуку ў галаве».

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ЧАСТУЙЦЕСЯ!

Леча

Спатрэбіцца: *перац балгарскі — 3 кг, таматная паста — 850 г, цукар — 0,5 шкл., соль — 1,5 ст. л., алей — 0,5 шкл., воцат — 1 ст. л.*

Перац памыць, ачысціць ад насення і нарэзаць хто як любіць (кубікамі або саломкай) і скласці ў каструлю, пажадана з тоўстым дном.

Таматную пасту развесці вадой ў прапорцыі 1:2. У перац дадаць соль, цукар, алей і таматны сок, які мы атрымалі з пасты. Паставіць каструлю на агонь і з моманту закіпання варыць 20-30 хвілін. Дадаць воцат. Раскласці ў падрыхтаваныя слоікі і закатаць.

Запяканка з баклажанаў і памідораў

Спатрэбіцца: *баклажаны — 4 шт. памідоры — 4 шт. вяршкі — 300 г, яйка — 6 шт. сыр — 100 г, базілік сушаны (на смак), соль і перац (на смак), маргарын (для змазвання формы).*

Баклажаны і памідоры вымыць. Баклажаны абсушыць і нарэзаць іх уздоўж пласцінамі таўшчынёй прыкладна 0,5 см. Пасаліць і скласці ў міску. Пакінуць на 10 хвілін, каб сышла гарката. Памідоры абліць кіпенем і ачысціць ад скуркі. Мякаць нарэзаць невялікімі кубікамі. У місцы ўзбіць вяршкі з яйкамі, пасаліць, паперчыць, дадаць базілік. Баклажаны выкласці ў форму, змазаную маргарынам. Баклажаны заліць яечна-вяршковай сумессю, пасыпаць нарэзанымі памідорамі і дзёртым сырам. Паставіць запякаць у духоўку на 30-40 хвілін.

Яблыкі ў кляры

Спатрэбіцца: *яблыкі — 500 г, сметанковае масла — 4-5 ст. л., цукар — 1/4 шкл., мука — 1/2 шкл., яйка — 4 шт. малако — 1/3 шкл., цукровая пудра (для абсыпкі), алей (для смажання), соль — 1/2 ч. л.*

Яблыкі мыем, чысцім ад лупіны, выдаляем сярэдзіну і костачкі, рэжам колцамі, таўшчынёй 0,5 см. Пасыпаем іх цукрам і пакідаем на 20-30 хвілін (пакуль будзем рабіць кляр). У ёмістасці растопліваем масла і дадаём туды 4 жаўткі (папярэдне аддзяліўшы жаўткі ад бялкоў). Змешваем. Дадаём 1 сталовую лыжку халоднага малака, 1 ст. лыжку цукру, 1/2 ч. лыжку солі і муку. Змешваем. Дадаём малако, якое засталося, і зноў змешваем. Узбіваем у густую пену бялкі і дадаём да нашай сумесі. Злёгку змешваем знізу ўверх, каб бялкі не аселі. Кожнае яблычнае колца памачыць у кляр і пакласці на патэльню з разагрэтым алеем. Падсмажваць яблыкі трэба на слабым агні, пакуль яны не падрумяняцца. Перад падачай пасыпаем цукровай пудрай.

-2872-

КЛОПАТЫ ГАСПАДАРА

Маставая з драўляных спілаў

Для такой маставой спілы трэба рабіць не менш за дваццаць сантыметраў па вышыні. Распілоўваць на кружкі можна любое дрэва, аднак цвёрдыя пароды прастаяць даўжэй. Для гэтага ідэальна падыдзе лістоўніца: кажуць, яе драўніна не вельмі схільная да гнення.

Перад кладкай падрыхтаваныя спілы трэба апрацаваць антысептыкам і затым высушыць. Састаў для апрацоўкі робіцца на аснове 10% меднага купарвасу і вады (можна таксама ўзяць заводскі антысептык для дрэва). Можна пайсці далей: тую частку, якая будзе звернута да зямлі, апрацаваць гудронам.

Пад дарожку неабходна падрыхтаваць пясчаную падушку — зняць глебу на вышыню спілаў (+ запас 5—10 см), засыпаць пяском і ўтрамбаваць.

Далей падрыхтаваныя спілы расстаўляем па ўсёй паверхні дарожкі, чаргуючы вялікія і маленькія, запаўняючы прамежкі падыходнымі па памерах. Трэба імкнуцца да таго, каб дарожка выглядала хораша: карыстацца ёй будзеце не адзін год.

Заключны этап па стварэнні драўлянай маставой — гэта засыпанне шчылін паміж спіламі дробнай галькай і жвірам (самыя дробныя можна запоўніць пяском).

ПАРАДАК У ДОМЕ

Дапаможа сода

❍ Харчовая сода выдатна знішчае любыя непрыемныя пахі. Напрыклад, у халадзільніку і маразільнай камеры, смеццевым вядры, аўтамабілі, каціным латку, абутковай шафе — увогуле ўсюды, дзе можа з'явіцца непрыемны пах. Для прафілактыкі можна распырскаць у патэнцыйна брудных месцах раствор соды.

❍ З дапамогай харчовай соды можна чысціць практычна ўсё. Ракавіны, ванны, кафлю, хром, нержавейку. Яна абсалютна нетаксічная, затое эфектыўная. Напрыклад, выдатна выдаляе вапняковыя адкладанні на металічных мыйках. Ёю можна пачысціць нават зубы, каб крыху адбяліць іх пасля ўжывання кавы ці моцнага чаю.

❍ «Ажывіце» дываны з дапамогай харчовай соды. Калі вы жадаеце пачысціць дываны і пазбавіць іх ад непрыемных пахаў (напрыклад, тытуню), распырскайце па паверхні раствор ці раскідайце парашок соды, пакіньце на паўгадзіны, а затым прапыласосьце. Гэты ж прыём дазволіць вам хутка пазбавіцца ад хімічнага паху новага дывана.

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

Каб выратаваць намоклую кнігу, трэба перасыпаць старонкі талькам, закрыць і пакласці пад прэс. Калі яны прасохнуць, працерці лісты мяккай анучкай і, лёгка ўдараючы па кнізе, стрэсці тальк.

-2873-

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	6.06	20.16	14.10
Віцебск	5.52	20.09	14.17
Магілёў	5.56	20.06	14.10
Гомель	5.56	19.59	14.03
Гродна	6.21	20.30	14.09
Брэст	6.25	20.27	14.02

Месяц

Першая квадра 24 жніўня.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Аляксея, Антона, Аркадзя, Вячаслава, Дзмітрыя, Івана, Пятра, Сяргея.*
К. *Луізы, Людвіка, Рыгора, Юзафа.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+19..+23°С	КІЕЎ	+26..+28°С	РЫГА	+19..+21°С
ВІЛЬНЮС	+17..+19°С	МАСКВА	+16..+20°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+16..+18°С

УСМІХНЕМСЯ

Злы кіроўца маршруткі ходзіць па кватэрах сваіх пасажыраў і ляпае дзвярыма халадзільнікаў.

У офісе.

— Люся, ты навошта мой кубак вымыла?

— Я што, знішчыла цывілізацыю, якая лічыла цябе вярхоўным правіцелем?

Ніколі не шанцавала з жонкамі: першая сышла, другая выгнала, а трэцяя наогул — жыве і жыве!

Дзяўчынка ў заапарку:

— Мама, чаму гэты казёл так сумна глядзіць кудысьці далёка-далёка?

— А ты свайго тату часта вясёлым бачыш? Жыццё ў іх такое...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 27.631. Індэкс 63850. Зак. № 3765.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 24 жніўня 2012 года.